ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ўдатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . . 10-74
Сакратар . . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЬНІК, 17 красавіка 1930 г. № 86 (3594)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

# Пастанова ЦК УсеКП(б)

## аб кіраўніцтве прампрадпрыемствамі ў сувязі з дакладам аб стане мэталяпрамысловасьці ад 10 красавіка 1930 году

Заслухаўшы даклад аб рабоце мэталяпрамысловасьці, ЦК УсеКП(б) канстатуе, што:

1. Мэтады кіраўніцтва прадпрыемствамі да гэтага часу не прыстасаваны да новых умоў рэканструкцыйнага пэрыяду, і дырэктары прадпрыемстваў, як правіла, абмяжоўваюцца так званым агульным кіраўніцтвам, але не стараюцца аўладаць тэхнікай прадпрыемства і звальваюць адказнасьць за тэхнічнае кіраўніцтва цалкам на тэхнікаў і спэцыялістых.

2. Раздваеньне кіраўніцтва тлумачыцца адсутнасьцю або невыстарчальнасьцю тэхнічных ведаў у дырэктароў прадпрыемстваў і дрэннай пастаноўкай справы вучобы і перакваліфікацыі кіраўнічага пэрсаналу прадпрыемстваў, а таксама загружанасьцю дырэктароў іншымі абавязкамі, пасяджэньнямі і інш.

3. Справа вылучэньня кваліфікаваных рабочых і савецкіх спэцыялістых на кіруючыя пасты прадпрыемстваў праходзіць надзвычай невыстарчальна і марудна.

4. На пераважнай большасьці прадпрыемстваў дырэктыва ЦК ад 5 верасьня 1929 году аб мерах па ўпарадкаваньні кіраваньня вытворчасьцю і ўстанаўленьні адзіначальля не праведзена ў жыцьцё.

5. ВСНГ СССР і аб'яднаньні мэталяпрамысловасьці не правялі для выкананьня гэтых дырэктыў усіх патрэбных практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць карэннае паляпшэньне ў справе кіраваньня вытворчасьцю.

6. Партыйныя і прафсыянальныя арганізацыі не прынялі выстарчальнага ўдзелу ў ажыцьцяўленьні гэтай дырэктывы, не мабілізавалі ўвагі рабочых вакол пытаньняў упарадкаваньня кіраўніцтва вытворчасьцю.

7. Рацыяналізатарскія работы (барацьба з аварыямі, прастоямі, бракам, арганізацыя працы і вытворчага працэсу і г. д.) не атрымалі належнага разьвіцьця.

8. З боку ВСНГ СССР, аб'яднаньняў і дырэктароў прадпрыемстваў ня былі ўжыты выстарчальныя меры да хуткага і энэргічнага зжываньня вынікаў шкодніцтва.

9. Справа вытворчага забясьпечэньня як па лініі забясьпечэньня органаў ВСНГ СССР і аб'яднаньняў, так і органаў унутрызаводзкага забясьпечэньня —пастаўлена нездавальняюча.

10. Таксама нездавальняючая пастаноўка плянавай работы ва ўсіх зьвеньнях прамысловасьці, асабліва ў справе ўвязкі вытворчасьці паміж паасобнымі цэхамі, заводамі і трэстамі. На падставе гэтага ЦК пастанаўляе:

1. ЦК выходзіць з таго, што дырэктары прадпрыемстваў у цяперашніх умовах рэканструкцыі прамысловасьці павінны быць ня толькі агульнымі кіраўнікамі прадпрыемстваў, але і абавязаны кіраваць тэхнікай вытворчасьці. Канстатуючы пэўны рост тэхнічнай граматнасьці ў цяперашняга складу дырэктароў, прызнаць гэта надзвычай невыстарчальным і абавязаць усе арганізацыі, якія ведаюць падборам работнікаў, падыходзіць да пытаньня вылучэньня кіраўнікоў прадпрыемствамі і цэхамі з пункту погляду ўладаньня гэтымі таварышамі патрэбнымі тэхнічнымі ведамі. Пры гэтым ЦК зварачае асаблівую ўвагу на неабходнасьць значнага паляпшэньня справы перападрыхтоўкі на хаду дырэктароў, начальнікаў цэхаў і іншых адказных кіраўнікоў прадпрыемстваў, паляпшэньне кіраўнічых кадраў шляхам больш сьмелага вылучэньня на адказную кіруючую работу ў прадпрыемствах як партыйных, так і адданых справе савецкай улады беспартыйных рабочых, майстроў, тэхнікаў, якія вызначаюцца сваімі ведамі вытворчасьці і адміністрацыйна - арганізацыйнымі здольнасьцямі.

ВСНГ СССР і праўленьням аб'яднаньняў мэталяпрамысловасьці ў тыднёвы тэрмін устанавіць парадак гэтай перападрыхтоўкі на хаду дырэктароў прадпрыемстваў, іх намесьнікаў, начальнікаў і памочнікаў буйнейшых цэхаў, кіруючых работнікаў аб'яднаньняў і інш., асыгнаваць для гэтай мэты ўсе патрэбныя сродкі і забясьпечыць плянамернае іх забясьпечэньне патрэбнай тэхнічнай літаратурай і настаўніцкім пэрсаналам з тым, каб у трохмесячны тэрмін усе дырэктары прадпрыемстваў прамысловасьці былі ахвачаны вучобай.

ВСНГ СССР да 15-га мая далажыць плян работы і аб прыступленьні да вучобы ня менш 50 дырэктароў прадпрыемстваў мэталяпрамысловасьці. Даручыць ВСНГ СССР арганізаваць у буйных прамысловых цэнтрах кароткатэрміновыя курсы для чытаньня лекцый групай дырэктароў (месячныя, двухтыднёвыя) па асобных дысцыплінах.

У мэтах зьнішчэньня дваістасьці ў кіраўніцтве вытворчасьцю ва ўсіх тых выпадках, дзе тэхнічныя дырэктары заводаў не зьяўляюцца намесьнікамі кіраўніка заводу, лічыць мэтазгодным назначэньне тэхнічнага кіраўніка (галоўны інжынэр, тэхнічны дырэктар) намесьнікам кіраўніка заводу па ўсіх пытаньнях кіраўніцтва прадпрыемствам.

Запрапанаваць ВСНГ СССР забясьпечыць ажыцьцяўленьне права дырэктарам прадпрыемстваў падбіраць сабе намесьнікаў па кіраўніцтве прадпрыемствам з тым, каб яны зацьвярджаліся трэстамі і аб'яднаньнямі.

2. Важнейшым пытаньнем у справе забясьпячэньня выкананьня вытворчых задач зьяўляецца падбор кіруючых кадраў у цэху (начальнік, яго намесьнік або памочнік, майстры, брыгадзіры і г. д.). Пры падборы гэтых кадраў трэба кіравацца перш за ўсё веданьнем справы, тэхнічнай падрыхтаванасьцю побач з наяўнасьцю адміністрацыйна - арганізацыйных здольнасьцяй. Запрапанаваць ВСНГ СССР і праўленьням аб'яднаньняў мэталяпрамысловасьці, побач з падборам на пост начальнікаў важнейшых цэхаў буйных гаспадарнікаў (дырэктары заводаў), уладаючых тэхнічнымі ведамі ў адпаведнай вытворчасьці, арганізаваць шырокае вылучэньне на пасады начальнікаў цэхаў, майстроў, брыгадзіраў і г. д., работнікаў вытворчага актыву як партыйных, так і беспартыйных, ня спыняючыся перад вылучэньнем беспартыйных рабочых, майстроў і спэцыялістых на самыя адказныя пасты.

Абавязаць ВСНГ СССР шырока разгарнуць сетку курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы сярэдняга і нижэйшага зьвяна адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу (начальнік цэху, майстар, брыгадзір, дзесятнік і г. д.), абавязаць ВСНГ СССР у двухмесячны тэрмін далажыць ЦК аб усіх мерапрыемствах па ўмацаваньні кіраўнічых кадраў у цэху.

3. У мэтах умацаваньня адзіначальля строга забараніць перакідваньне рабочых або асоб малодшага тэхнічнага пэрсаналу заводу па ўсякага роду мабілізацыях або па індывідуальных назначэньнях бяз згоды дырэктара заводу або начальніка цэху, абавязаць партыйныя і прафсыянальныя арганізацыі ў правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў такога роду мець на ўвазе асабходнасьць поўнага забясьпячэньня посьпеху вытворчай праграмы. Таксама забараніць выклік бяз згоды дырэктароў заводаў або начальніка цэху ў рабочы час для якіх-бы там ні было мэт работнікаў заводаў, абавязаных знаходзіцца на вытворчасьці. Катэгарычна забараніць скарыстаньне цэхавага адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу ў часе выкананьня ім сваіх абавязкаў для ўсякага роду пасяджэньняў, выклікаў, абследваньняў і г. д. Аплату мабілізаваным рабіць, паколькі ня будзе асобых пастаноў па гэтым пытаньні, за кошт тых устаноў і прадпрыемстваў, для якіх гэта мабілізацыя робіцца.

4. Устанавіць ва ўсіх прадпрыемствах такі парадак работ, пры якім ёсьць адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал заводу, пачынаючы ад дырэктара і галоўнага інжынэра і канчаючы начальнікамі цэхаў і іх памочнікамі, і каб ён знаходзіўся пастаянна на вытворчасьці, устанавіўшы чаргу прабываньня паасобных кіруючых работнікаў у розных цэхах і ў розныя тэрміны і пасьлядоўныя прымацаваньні кіруючых работнікаў да паасобных цэхаў.

У мэтах максымальнай разгрузкі як начальнікаў цэхаў, так і майстроў ад канцылярскай работы і сканцэнтраваньня іх увагі цалкам на пытаньнях вытворчасьці—забясьпечыць ім ва ўсіх неабходных выпадках назначэньне спэцыяльных работнікаў, на якіх яны маглі-б перакладаць гэтыя функцыі.

6. Лічачы неабходным максымальнае скарачэньне абсьледваньняў на прадпрыемствах і ўхваляючы пастановы ЦКК і РСІ па гэтаму поваду, прасіць ЦКК і РСІ разам з УсеЦСПС і ВСНГ у двухтыднёвы тэрмін распрацаваць і апублікаваць патрэбныя паказаньні мясцком у гэтым напрамку.

7. Упарадкаваньне кіраўніцтва вытворчасьцю настойліва патрабуе значна большай актыўнасьці ў вытворчасьці з боку інжынэраў і тэхнікаў. Побач з выключэньнем з іх радоў шкодніцкіх элемэнтаў, трэба паставіць важнейшай задачай—задачу па сапраўдным палітычным перавыхаваньні асноўнай масы спэцыялістых і набліжэньні іх да партыі і рабочае клясы. Савецкія спэцыялістыя павінны мець упэўненасьць у падтрыманьні пры правядзеньні імі неабходных мерапрыемстваў, забясьпечваючых правільную арганізацыю працы ў вытворчасьці.

ВСНГ і УсеЦСПС распрацаваць рад мерапрыемстваў па зьмяншэньні перакідваньня спэцыялістых і накіраваньня спэцыялістых у найбольш важныя раёны, прадпрыемствы, цэхі, будаўніцтвы і г. д. з пункту погляду забясьпячэньня выкананьня прамфінпляну, які вызначаецца. У прыватнасьці ўстанавіць, што значная большасьць наяўнага складу інжынэраў і тэхнікаў у прадпрыемствах павінна працаваць напасрэдна на вытворчасьці ў якасьці зьменных інжынэраў, пам. заг. цэхаў і г. д. Трэба таксама дабіцца, каб спэцыялістыя, што працуюць у апаратах заводакіраўніцтва, пэўную частку свайго рабочага часу праводзілі-б на вытворчасьці, асабліва на найбольш важных вучастках работы. Устанавіць, што інжынэры, тэхнікі і майстры на вытворчасьці павінны быць прыроўнены да рабочых у адносінах забясьпячэньня і паляпшэньня жыльлёвых умоў.

УсеЦСПС, ВСНГ і Наркамгандлю забясьпечыць выкананьне гэтае пастановы не пазьней 1-га мая.

8. Канстатуючы, што, як правіла, аб'яднаньні мэталяпрамысловасьці не наладзілі тэхнічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі, абавязаць ВСНГ СССР арганізаваць з боку аб'яднаньняў сыстэматычнае тэхніка-вытворчае кіраўніцтва прадпрыемствамі, пры дапамозе інструктаваньня і кансультацыі па важнейшых галінах работы, у першую чаргу па буйных прадпрыемствах і цэхах, непасрэдным выездам на месцы на доўгі пэрыяд адпаведных груп спэцыялістых і членаў праўленьняў аб'яднаньняў і трэстаў як па пытаньнях бягучай работы прадпрыемстваў, так і па пытаньнях рацыяналізацыі і рэканструкцыі.

9. ЦК прапануе усім партыйным і прафсыянальным арганізацыям неадкладна прыступіць да шырокага асьвятленьня перад рабочымі масамі дырэктыў ЦК аб мерах па ўпарадкаваньні кіраваньня вытворчасьцю і ўстанаўленьні адзіначальля і асноўных палажэньняў гэтае пастановы ЦК з тым, каб асноўная ўвага рабочых і спэцыялістых была мабілізавана на рашучае і хутчэйшае зьнішчэньне недахватаў у вытворчасьці, устанавіць сыстэматычную праверку выкананьня гэтых дырэктыў з максымальным прыцягненьнем рабочых да гэтай работы. Абмеркаваньне гэтых дырэктыў увязаць з актыўным удзелам рабочых і спэцыялістых у распрацоўцы і правядзеньні неабходных канкрэтных мерапрыемстваў па выкананьні бягучых прамфінпляну і плянаў рэканструкцыі прадпрыемстваў ня толькі ў колькасных, але і ў якасных адносінах (сабекошт, зьніжэньне браку і г. д.).

Разам з тым, ЦК прапануе ужыць усе меры да стварэньня ўмоў, якія сапраўды забясьпечваюць практычнае ажыцьцяўленьне адзіначальля, пачынаючы з дырэктароў заводу і канчаючы цэхавай адміністрацыяй. У прыватнасьці трэба рашуча зжыць усякае ўмяшаньне партыйных і прафсыянальных арганізацый у апэрацыйныя распараджэньні адміністрацыі прадпрыемстваў і цэхаў і поўнасьцю забясьпечыць за дырэктарам і начальнікамі цэхаў права самастойнасьці, назначэньня і перамяшчэньня адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

10. ЦК канстатуе, што ў радзе важнейшых гаспадарчых раёнаў (Уральскі, Донбас, Крываружжа), ня гледзячы на рад ухваленых ЦК пастаноў і рост з году ў год асыгнаваньня сродкаў, матар'яльна-бытавыя і культурныя ўмовы жыцьця рабочых-мэталістых застаюцца нездавальняючымі, галоўным чынам з-за дрэннага кіраўніцтва і нерацыянальнага скарыстаньня гэтых сродкаў.

Запрапанаваць у 3-хмесячны тэрмін з удзелам мясцовых арганізацый заслухаць даклады Наркамгандлю, Цэнтрасаюзу і ВСНГ аб стане гэтай работы і неабходных мерапрыемствах, якія забясьпечваюць значнае паляпшэньне пастаноўкі гэтае справы ў першую чаргу ў Донбасе, Крываружжы і на Урале. Запрапанаваць ЦК КП(б)У і Уралабкому з свайго боку ўжыць усе неабходныя меры для паляпшэньня партыйнага кіраўніцтва з мэтаю паляпшэньня матар'яльна-бытавых і культурных умоў жыцьця рабочых. 25-га мая 1930 году заслухаць на ЦК даклад аб ходзе гэтай работы.

11. Праз 6 месяцаў заслухаць у ЦК даклад ВСНГ і дырэктароў прадпрыемстваў мэталяпрамысловасьці аб правядзеньні дырэктывы ЦК ад 5-IX 29 г. аб мерах па ўпарадкаваньні кіраўніцтва вытворчасьцю і ўстанаўленьні адзіначальля. Сьпіс прадпрыемстваў устанавіць ВСНГ і НК РСІ.

12. Запрапанаваць ВСНГ скончыць да 1-га чэрвеня давядзеньне гаспадарчага разьліку да кожнага цэху, а вытворчага заданьня да кожнага агрэгату і кожнай брыгады, падпарадкуючы ўстаноўлены плян папярэдняму абмеркаваньню з пункту погляду магчымасьці найлепшага яго выкананьня і перавыкананьня на вытворчых нарадах, сходах ударных брыгад і г. д.

13. З прычыны выключнай важнасьці арганізацыі правільнага вытворчага забясьпячэньня заводаў, даручыць ВСНГ СССР і аб'яднаньням распрацаваць сыстэму арганізацыі органаў забясьпячэньня заводаў такім чынам, каб было забясьпечана як бесьперабойнае выкананьне пляну, так і адказнасьць органаў заводакіраўніцтва, аб'яднаньня і цэнтральнага апарату ВСНГ СССР у справе забясьпячэньня заводаў. Запрапанаваць у 2-хмесячны тэрмін заслухаць даклад ВСНГ аб мерах паляпшэньня вытворчага забясьпячэньня.

14. Лічачы шэрагам невыстарчальным удзел друку ў справе правядзеньня дырэктывы ЦК аб мерах па ўпарадкаваньні кіраўніцтва вытворчасьцю і ўстанаўленьні адзіначальля, даручыць аддзелу культуры і прапаганды ЦК даць патрэбныя паказаньні ў друку.

З прычыны таго, што адзначаныя недахопы ў кіраваньні прадпрыемствамі мэталяпрамысловасьці ўласьцівы большасьці прадпрыемстваў іншых галін прамысловасьці, як аб гэтым сьведчаць назіраньні членаў ЦК, камандыраваных на праверку выкананьня прамфінпляну, ЦК УсеКП(б) пастанаўляе: пашырыць пастанову ЦК УсеКП(б) аб кіраўніцтве прампрадпрыемствамі ў сувязі з дакладам аб стане мэталяпрамысловасьці ад 10-га красавіка 1930 году на ўсе галіны прамысловасьці.

*ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА*

АРГАНІЗАВАНАЯ КАЛЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА НА ПАЛЕХ—

# ЛЕПШЫ АГІТАТАР

ЗА ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

## КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ, УЦЯГВАЙЦЕ ІНДЫВІДУАЛЬНІКАЎ У АРГАНІЗАВАНУЮ СЯЎБУ

## Калгасы дружна пачалі палявыя работы

### Індывідуальны сэктар значна адстае

У Старобінскім раёне, Бабруйскай акругі, налічваецца зараз 27 калгасаў, якія аб'яднаюць 804 двары. Гэтыя калгасы павінны будуць засеяць 20 проц. усяго яравога кліну раёну. У калгасах налічваецца каля 10 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак раёну. У выніку прырэзкі калгасам кулацкай зямлі і запасных фондаў, на кожную сям'ю, якая ўвайшла ў калгас, прыходзіцца амаль падвойная норма ў параўнаньні з сярэдняй нормай зямлі, што прыпадае на індывідуальную гаспадарку. Адсюль становяцца зусім зразумелымі тыя труд пасьці з цягавай рабочай сілай, якія ствараюцца ў некаторых калгасах.

Перагібы і скрыўленьні, якія раней мелі месца, зараз рашуча выпраўляюцца.

Апошні артыкул тав. Сталіна «Адказы таварышом калгасьнікам» і пастанова ЦК УсеКП(б) аб новых ільготах калгасам унесьлі вялікае ажыўленьне сярод калгасьнікаў.

Групы беднаты арганізаваны толькі па 13-ці асноўных калгасах. Аднак, ужо назіраецца пэўны пералом у сэнсе разгортваньня работы сярод беднаты. У раёне адбыліся з нарады груп беднаты, на якіх абмяркоўвалася пытаньне аб падрыхтоўцы да сяўбы.

У большасьці сельсаветаў батракі ўцягнуты ў калгасы, але яшчэ ня ўсе. Ёсьць выпадкі, калі батракі выходзяць з калгасаў, аднак, тут яшчэ не заняліся вывучэньнем прычын гэтага зьявішча.

Усе калгасы пераведзены на новы статут сельска-гаспадарчай арцелі. Яравы клін вызначаны ўсім калектывам.

Паводле вестак сельсаветаў, у калгасах абагулены 72 капі. 2 месячковыя калгасы адчуваюць недахват кармоў. Пасеньнем калгасы забясьпечаны на 100 проц.

Некалькі горш з арганізацыяй працы. У большасьці калгасаў новыя рабочыя пляны яшчэ ня складзены і адпаведныя брыгады ня вызначаны.

З 27-мі калгасаў 10 зрабілі пробны выезд у поле, які паказаў, што ў асноўным калгасы падрыхтаваны да сяўбы. 10 калгасаў пачалі ўжо сяўбу.

Зусім іншы малюнак на індывідуальным сэктары, які падрыхтаваны да сяўбы нездавальняюча, індывідуальным гаспадаркам яравы клін вызначаны, аднак, да палявых работ яны яшчэ не прыступілі.

Плян пашырэньня засеўнае плошчы яшчэ не даведзены да асобнага двара. Індывідуальны сэктар яшчэ цалкам не адрамантаваў с.-г. машын і прылад.

Нездавальняюча ідзе работа па забясьпячэньні бядняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў калгасы, неабходнымі сродкамі вытворчасьці. Да гэтага часу ня складзены сьпісы бедняцкіх, якім патрэбна дапамога насеньнем. На складах райпаляводсаюзу ляжаць аднаконныя плугі нераспраданымі.

Паводле вестак райпаляводсаюзу, раён забясьпечан насеньнем усіх культур, за выключэньнем вікі. Назіраюцца факты, калі прысланы гатунковы авёс аказваўся зялёным, нечыстым, вельмі кепскай якасьці. Калгасы і паасобныя гаспадаркі адмаўляюцца яго браць у абмен на звычайны авёс.

Кантрактацыя збожжавых культур у калгасах праведзена нездавальняюча і зьяўляецца перэальнай. У індывідуальным сэктары яна амаль зусім не праводзілася.

Агульны вывад такі. Калгасы, ня гледзячы на арганізацыйныя і гаспадарчыя труднасьці, у асноўным падрыхтаваўшыся да сяўбы, даволі дружна пачалі палявыя работы. Трэба зараз-жа прыняць належныя мерапрыемствы да забясьпячэньня выкананьня пляну веснавой сяўбы індывідуальным сэктарам, які па плошчы ворнай зямлі займае каля 80 проц.

Старшыня праверкому МАЧУЛЬСКІ.

ПІЯНЭР КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НА КЛІМАЎШЧЫНЕ

Калгас «Ленінскі Шлях», які аб'яднае звыш 2.000 гэкт. першым пачаў калектыўны рух на Клімаўшчыне.

На здымку: калгасьнікі «Ленінскага Шляху» арганізаваным парадкам пачынаюць сяўбу.

## ІЛЬГОТНЫ ВОДПУСК С.-Г. МАШЫН КАЛГАСАМ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ГАСПАДАРКАМ

З мэтай пайхутчэйшага прасоўваньня с.-г. машын у вёску, Эканамнарада БССР устанавіла рад наступных ільгот, як калгасам, так і індывідуальным бядняцка-сераднякім гаспадаркам пры водпуску ім с.-г. машын: аднаконныя плугі, ручнаконныя малатарні і прывады да іх, барабанныя сячкарні, арфы і 8-ведзерныя сэпаратары **—адпускаюцца калгасам і індывідуальным бядняцка-сераднякім гаспадаркам без задатку.** Грошы выплачваюцца за вышэйпералічаныя машыны **пасьля рэалізацыі ўраджаю бягучага году,** але не пазьней 1-га кастрычніка.

Іншыя с.-г. машыны выдаюцца **ў крэдыт з паменшаным разьмерам задатку,** які вызначаецца на мясцох у залежнасьці ад наяўнасьці машын і крэдытаў, пры індывідуальным падыходзе ў кожным асобным выпадку. Выплата вымешаных задаткаў таксама дазваляецца увосень, але не пазьней 1-га кастрычніка.

***

**У «Зьвязьдзе» ад 2-га красавіка быў зьмешчаны адкрыты ліст калгасу «Свабода», Чэрэйскага раёну (Аршаншчына), аб тым, што ў калгасе забралі трактар для трактарнай калёны і нічога не зрабілі, каб забясьпечыць калгас цягавай сілай.**

**На гэты ліст Аршанскі акрвыканкасаюз прыслаў адказ, у якім паведамляе рэдакцыю, што калгас «Свабода» мае ня 6 коняй, як адзначана ў лісьце, а 9.**

**Але, улічваючы, што з калгасу забралі трактар, Чэрэйскаму крэдытнаму таварыству даны загад аб выдачы калгасу «Свабода» 600 руб. у крэдыт на куплю коняй. На гэтыя грошы можна будзе набыць 6 коняй. Такім чынам, у калгасе будзе 15 коняй. Акрамя таго, трактарная калёна, якая працуе на калёнізацыйным фондзе ў Чэрэйскім раёне, будзе абслугоўваць і ваколічныя калгасы, у тым ліку і калгас «Свабода».**

## УЗМАЦНІЦЬ ТЭМП КАНТРАКТАЦЫІ

Наркамгандлю, Наркамзем і Белпаляводсаюз зьвярнуліся да акргандлю, акрпаляводсаюзаў з прапановай тэрмінова праверыць прычыны слабага ходу кантрактацыі ў індывідуальным сэктары. У тых выпадках, калі прычынай слабага ходу кантрактацыі зьяўляецца § 7 тыповага дагавору на кантрактацыі, паводле якога члены сельскай грамады абавязаны ўступіць на працягу двух месяцаў пайшчыкамі вытворчага таварыства, якое арганізавана на тэрыторыі сельсавету, **дык у такіх выпадках дазваляецца ня прытрымлівацца гэтага параграфу.**

Таксама, як выключэньне, у паасобных выпадках, калі няма магчымасьці згуртаваць бядняцка - сераднякіх гаспадаркі ў асобныя групы для заключэньня з імі дагавораў па кантрактацыі, дазваляецца заключаць дагаворы з паасобнымі бядняцка-сераднякімі гаспадаркамі.

Акрамя таго, крэдытным таварыствам запрапанавана забясьпечваць вытворчымі крэдытамі індывідуальныя бядняцка-сераднякія гаспадаркі ў межах пляну крэдытаваньня раёну.

## Кулацкія правакацыі церпяць крах

**6 і 7-га красавіка 8 калгасаў Жлобінскага раёну пачалі сяўбу. На працягу двух дзён ужо заарана звыш 200 гэктараў. Настрой калгасьнікаў бадзёры. Усе гэтыя калгасы выйшлі ў поле падрыхтаванымі. Рабочая сіла разьмеркавана на брыгады. Трактары ў калгасах «Эрстэр май» і «Імя 11-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі» працуюць у дзьве зьмены.**

**Цікавы факт адбыўся ў вёсцы Мормаль. Пад уплывам кулацкай агітацыі частка беднякоў і сераднякоў, якія ня ўступілі ў калгас, адмовілася ад вызначанай для іх зямлі. Мясцовая парт'ячэйка пачала актыўную барацьбу з кулацкай агітацыяй, было праведзена некалькі сходаў беднаты.**

**У выніку, калі калгасьнікі вёскі выехалі ў поле, да іх далучыліся таксама і індывідуальныя бядняцка-сераднякія гаспадаркі, якія часова былі падпалі пад уплыў кулакоў.**

Брыгадзір «Зьвязды» АПЯКІН.

## Адвесьці яравы клін індывідуальным гаспадаркам

### ТЭЛЕГРАМА т. МАСЮКОВА ЧЭРЫКАЎСКАМУ РВК

У СУВЯЗІ З ТЭЛЕГРАМАЙ БРЫГАДЗІРА «ЗЬВЯЗДЫ» т. ВОІНАВА АБ ПАГРАЖАЮЧЫМ СТАНОВІШЧЫ З ПАДРЫХТОЎКАЮ ДА СЯЎБЫ Ў ЧЭРЫКАЎСКІМ РАЁНЕ (гл. «Зьвязду» №85) НАМ. НАРКАМЗЕМА БССР ТАВ. МАСЮКОВЫМ ПАСЛАНА Ў ЧЭРЫКАЎ НАСТУПНАЯ ТЭЛЕГРАМА:

«ЧЭРЫКАЎ РВК. ТЭРМІНОВА АДВЕСЬЦІ ЯРАВЫ І ПАПАРНЫ КЛІН ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ГАСПАДАРКАМ. РАЗДАЦЬ НАСЕНЬНЕ І ІНВЭНТАР У АДПАВЕДНАСЬЦІ З ІСНУЮЧЫМІ ДЫРЭКТЫВАМІ.

Нам.наркамзема БССР МАСЮКОЎ».

## Заарана 1.000 гэктараў

КРУПКІ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). АДВОД ЯРАВОГА КЛІНУ КАЛГАСАМ СКОНЧАНЫ. 8-га КРАСАВІКА Ў РАЁНЕ ПАЧАЛІСЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ. У 23 КАЛГАСАХ УЖО ЗААРАНА КАЛЯ 1000 ГЭКТАРАЎ. ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫЯЖДЖАЕ Ў ПОЛЕ РЭШТА КАЛГАСАЎ.

КАЛГАСЬНІКІ ПРАЦУЮЦЬ З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ, ЗВЫШ УСТАНОЎЛЕНАГА ТЭРМІНУ. НАСЕНЬНЕМ КАЛГАСЫ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ. АДЧУВАЕЦЦА НЕДАХВАТ КОРМУ.

ПАСЬЛЯ ВЫХАДУ КАЛГАСАЎ У ПОЛЕ І РАСТЛУМАЧЭНЬНЯ АПОШНІХ ПАСТАНОЎ АБ ІЛЬГОТАХ КАЛГАСАМ, ПАЧАЎСЯ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ.

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СЭКТАР ЗНАЧНА АДСТАЕ. СЕЛЬСАВЕТЫ НІЧОГА НЯ РОБЯЦЬ ДЛЯ ЗАБЯСЬПЯЧЭНЬНЯ БЯДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК НАСЕНЬНЕМ І ПРАЦОЎНАЙ ДАПАМОГАЙ. РАЙВЫКАНКОМ ТАКСАМА НА ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СЭКТАР НЕ ЗВАРАЧАЕ НІЯКАЕ ЎВАГІ.

Старшыня праверкому СЯНЬКО.

## ЯРАВЫ КЛІН НЯ ВЫЗНАЧАНЫ

### *Касьцюкоўшчына да сяўбы не падрыхтавана*

На сёньняшні дзень у Касьцюковіцкім раёне налічваецца 49 калгасаў. Калектывізавана 12 проц. двароў. Калгасы аб'ядноюць 36 проц. усяе ворнае зямлі.

Раньнюю веснавую сяўбу, асабліва ячменю, можа сарваць незакончанасьць зямляўпарадкаваньня. Шмат якім калгасам яшчэ ня вызначаны яравы клін. Сельсаветы кепска спраўляюцца са сваёй задачай па вызначэньні яравога кліну індывідуальнаму сэктару.

Пагрозу веснавой сяўбе ў калгасах стварае нястача цягавае сілы. Трэба Магілеўскаму акрвыканкому пад гэтым пытаньнем сурёзна задумацца пакуль ня позна.

Як выявілася, некаторыя сельсаветы займаліся «очковтирательством». Балынкавіцкі сельсавет увесь час паведамляў, што ў яго ачышчана 100 проц. насеньня, у той час, як многія вёскі зусім ня выканалі гэтага заданьня. Рабочыя пляны ў вялікай колькасьці калгасаў ня складзены. Нават, у самай вялікай камуне «Зьвязда» аграномы не дапамагалі складаць рабочы плян. Прышлося ўсё рабіць самому калгаснаму актыву. Аграномы да выкананьня сваіх абавязкаў адносяцца фармальна, безадказна.

Да гэтага часу райкалгассаюз не правёў абмену гатункова насеньня.

130 тысяч рублёў крэдытаў, вызначаных для калгасаў, ляжаць нескарыстаны.

Райкалгассаюз закантрактаваў толькі 577 гэктараў яравых пасеваў, што фактычна азначае зрыў кантрактацыі.

Новыя ільготы калгасам і артыкул тав. Сталіна «Адказ таварышом калгасьнікам» ячэйкамі папулярызуюцца слаба. У некаторых мясцох гэта работа яшчэ не распачата з прычыны спазьненьня пошты, якая ў аддаленыя сельсаветы едзе «на валох».

Батрацка - бядняцкіх груп няма ў 30 калгасах і 15 сельсаветах. Гэтымі днямі адбыўся райпартсход, але ні адзін партыец ня выступіў у спрэчках па пытаньні аб нездавальняючай працы з беднатой у калгасах. Абмежаваліся толькі ўхваленьнем рэзалюцыі. Гэта сьведчыць, што Касьцюковіцкая райпартарганізацыя да гэтага часу не ўсьвядоміла сабе важнасьці работы сярод беднаты.

Сход канстатаваў факты скрыўленьня партыйнай лініі ў паасобных ячэйках і... запісаў аб неабходнасьці весьці рашучую барацьбу са скрыўленьнямі партлініі. Аднак, у сходу не хапіла бальшавіцкай адвагі моцна ўдарыць па канкрэтных носьбітах зла.

Брыгадзір «Зьвязды» В. ВОІНАЎ.

ПАСТАНОВУ ЦК Усе КП(б)Б у масы

На здымку: рабочы брыгадзір чытае «Зьвязду» з артыкулам т. Сталіна «Адказы таварышам калгасьнікам» і пастанову ЦК аб Ільготах калгасам—калгасьнікам «Ленінскага Шляху» і сялянам вакольных вёсак.

## БЕЛСЕЛЬТРЭСТ ПАЦЬВЯРДЖАЕ

У «Зьвязьдзе» ад 2-га красавіка быў зьмешчан рад фактаў аб непадрыхтаванасьці саўгасаў да сяўбы. Усе гэтыя факты адпавядаюць сапраўднасьці. Белсельтрэстам у зьвязку з гэтым дана тэлеграма кіраўніку саўгасу «Забалачыцы» ўжыць тэрміновыя меры да рамонту інвэнтару і ўзмаціць рэальную дапамогу калгасам. Упоўнаважаны па насеўкампаніі т. Рачыцкі аддаў загад акруговым упоўнаважаным аб забясьпячэньні саўгасаў тым насеньнем, якога ім не хапае. У саўгасе імя Дзесяцігодзьдзя Кастрычніка пасланы 23 вагоны карпаліту. Упоўнаважанаму па Мазырскай акрузе запрапанавана сабраны ў Капцэвічах попел таксама перадаць саўгасу імя Дзесяцігодзьдзя Кастрычніка. Саўгасу Некрашчы дано заданьне загатовіць бульбу на месцы, або атрымаць яе з бліжэйшых саўгасаў. Весткі з саўгасаў сьведчаць аб тым, што найбольшыя прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы заўважаны ў галіне арганізацыі працоўнай дысцыпліны і арганізацыі працы. Сацыялістычнае спаборніцтва вакол падрыхтоўкі да сяўбы не разгорнута. Усё гэта патрабуе ад кіраўнікоў саўгасаў, рабочых калектываў, парт'ячэек і прафсаюзных арганізацый саўгасаў сапраўднай ударнай работы па падрыхтоўцы да сяўбы і па рэальнай дапамозе калгасам.

Нам. старшыні Белсельтрэсту ДУЧЫНЬНІКАЎ.

## ТРАКТАРЫСТЫ БЯЗ ХАРЧУ, МАШЫНЫ БЕЗ ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК

# Правал „бежанскай“ правакацыі польскага фашызму

ВІЛЬНЯ, 12. Польскі фашысцкі друк у апошнім часе праводзіў правакацыйныя кампаніі ў сувязі з выдуманай «хваляй масавага ўцяканьня з СССР у Польшчу».

Зараз, нават, афіцыйныя фашысцкія органы і службовыя асобы прымушаны прызнацца ў поўным правале гэтае правакацыі.

Газэта «Польска» зьмяшчае гутарку віленскага карэспандэнта з начальнікам пагранічнай аховы Польшчы — Брыноўскім аб становішчы па савецка - польскай мяжы.

Брыноўскі прымушаны адказаць, што «ўцекачы складаюць толькі некалькі дзесяткаў чалавек, якія зьяўляюцца пераважна жыхарамі пагранічча і маюць сваякоў за мяжою, а некаторыя і сваю зямлю. Акрамя гэтага, гэта амаль усе кулакі, якія ня прымаюцца ў калгасы і падлягаюць высяленьню ў глыбіню Расіі».

## Дымавая заслона польскіх сац.-фашыстых

ВАРШАВА, 11. Блізкі да пілсудчыкаў друк першапачаткова прабаваў замаўчаць артыкулы **Дмоўскага** аб падрыхтоўцы вайны супроць СССР. Аднак, гэта яму не ўдалося з прычыны вялікага ўражаньня, якое артыкулы зрабілі сярод працоўных мас як у Польшчы, так і за мяжой.

Газэты «Кур'ер Чырвоны» і «Пшэглёнд Вячорні», якія падтрымліваюць урад, абвінавачваюць Дмоўскага ў тым, што сваімі артыкуламі ён сее анархічныя настроі, якія «выкарыстоўвае савецкі друк».

«Роботнік» задае пытаньне: «Ці праўда тое, што польскі палкоўніцкі ўрад гатоў даць сябе выкарыстаць у якасьці зброі для інтарэсаў інтэлігенцыі ў інтарэсах англійска - нямецка - францускага фінансавага капіталу, або ў інтарэсах аўладаньня Украіны для папярэдняя ўплыву Ватыкану». «Работнік» сьцьвярджае, што ён ня верыць у магчымасьць узбуджэнага канфлікту паміж СССР і Польшчаю, аднак, ён лічыць патрэбным патрабаваць ад польскага ўраду, каб апошні публічна выказаў сваё назыцыю ў гэтым пытаньні. (ТАСС).

## Расстрэл рабочых у Олькушы

ВАРШАВА, 10. На чыгуна-ліцейным заводзе ў Олькушы ўзьнік канфлікт паміж рабочымі і адміністрацыяй з прычыны звальненьня 300 рабочых. Рабочыя патрабавалі адмены пастановы аб звальненьні. Дырэктар заводу адмовіўся. У адказ на гэта рабочыя выцягнулі дырэктара з дому і прывялі яго на мітынг, дзе абмяркоўвалася становішча рабочых. Прыбыўшым на выручку дырэктара паліцэйскім рабочыя аказалі жорсткае супраціўленьне і прабавалі іх разброіць. Паліцыя дала залп па дэманстрантах.

Паранена 8 рабочых, з іх адзін сёньня памёр.

Паведамленьне аб сьмерці гэтага рабочага паслужыла сыгналам да адкрытага выступленьня дэманстрацый. Адміністрацыя фабрык найшла пад націскам рабочых на некаторыя ўступкі. Аналёгічныя падзеі разгараліся ўчора на гуце. Дырэкцыя гуты пастанавіла звольніць 120 рабочых, але рабочыя заводу катэгарычна патрабавалі прыняцьця назад звольненых рабочых. Атрымаўшы адмову, рабочыя выкінулі дырэктара фабрыкі на вуліцу. Паліцыя, якая прыбыла на дапамогу дырэктару, прымусіла дэманстрантаў разыйсьціся. Праўленьне фабрыкі абвясьціла лёкаўт. (ТАСС).

## УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ РЭДКАЛЕГІЙ ЗАВОДСКІХ ГАЗЭТ

Учора вечарам, у вялікай залі Дому Камасьветы, адкрылася ўсебеларуская канфэрэнцыя рэдактароў фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт, сумесна з рабкорамі, ваякорамі, інжынэрна-тэхнічнымі працаўнікамі, гаспадарнікамі і працаўнікамі друку гор. Менску.

На канфэрэнцыю прыбыло звыш 50 дэлегатаў.

Канфэрэнцыю адкрыў намесьнік загадчыка культпропу ЦК КП(б)Б тав. **Будзінскі**, які ў сваім уступным слове спыніўся на значэньні канфэрэнцыі.

— Канфэрэнцыя сабралася ў момант, калі ўвесь край працуе над ажыцьцяўленьнем нячуваных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Адным з асноўных вагароў гэтых тэмпаў зьяўляецца наш савецка - партыйны друк, галоўная роля ў якім належыць рабкору.

Тав. Будзінскі, ахарактарызаваўшы задачы сацыялістычнага будаўніцтва, адзначыў ролю друку ў выкананьні генэральнай лініі партыі.

Аспоўная задача — **выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.** Друк павінен перакласьці пяцігадовы плян на мову бягучага дня, давесьці яго да кожнага варштату, цэху; задача фабрычна - заводзкага друку — дабіцца, каб кожны рабочы адчуваў сваю адказнасьць за выкананьне генэральнага пяцігадовага пляну.

Некаторыя лічбы сьведчаць аб вялізарнай ролі савецка - партыйнага друку. Калі ў мінулым годзе на СССР штодзённа папыралася 13 млн. экз. газэт, дык зараз гэтая лічба павялічылася (разам з заводзкімі шматтыражкамі) — да 24 млн. — у 8 раз больш, чым у дарэвалюцыйны час. Гэтыя лічбы — паказьнікі вялікай арганізуючай ролі друку, яго ўдзельнай вагі

Канфэрэнцыя абрала прэзыдыум з 23 чал. — прадстаўнікоў культпропу ЦК КП(б)Б, ЦСПСВ, рабкораў, ваякораў і рэдактароў цэнтральных газэт.

У ганаровы прэзыдыум абраны т. т. Сталін, Молатаў, рэдкалегія газэты «Правда», бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б.

Канфэрэнцыя паслала прывітаньне ЦК УсеКП(б) і газэце «Правда», ЦК КП(б)Б і газэце «Зьвязда», а таксама камуністычнаму друку Польшчы і Зах. Беларусі.

З прывітаньнем ад імя ЦК КП(б)Б выступіў тав. **Сянькевіч**, які перадаў бальшавіцкае прывітаньне армії рабкораў - ударнікаў, ахарактарызаваў пастанову апошняга пленуму ЦК КП(б)Б аб выкананьні прамфінпляну і спыніўся на задачах партыйна - савецкага друку.

З вялікім дакладам аб выкананьні прамфінпляну і задачах гаспадарчых, партыйных і прафэсыянальных арганізацый выступіў нам. старшыні ВСНГВ тав. **Васнабойнікаў.** (Падрабязная справаздача ў заўтрашнім нумары).

***

У фае Дому Камасьветы адчынена выстаўка заводзкіх шматтыражак, камуністычнай прэсы Захаду і савецкага друку часоў 1917—19 г. г., арганізаваная габінэтам журналістыкі пры КУБ.

## Сацыял-фашыстыя--ярыя абаронцы богаро дзіцы

ВАРШАВА, 12. «Роботнік» — орган польскіх сацыял-фашыстых прымаў актыўны ўдзел у «рэлігійнай» антысавецкай кампаніі. У сувязі з гэтым, «Роботнік» сыстэматычна праводзіць таксама цкаваньне польскіх вольнадумцаў. Ён правакуе польскіх вольнадумцаў, гаворачы, што яны працуюць на грошы Масквы. У апошнім нумары «Роботніка» гаворыцца, паміж іншым, наступным чынам: «Апошні нумар «вольнадумцаў» у няпрыстойным спосабе трактуе культ богародзіцы».

### КАТАРЖНЫ ПРЫСУД ЗА АНТЫРЭЛІГІЙНЫ АРТЫКУЛ

ВАРШАВА, 12. Як паведамляе «Газэта Варшавска», Варшаўскі акруговы суд прыгаварыў рэдактара аднэй правінцыяльнай газэты Мячкоўскага на год катаргі за зьмяшчэньне ў сваёй газэце карэспандэнцыі антырэлігійнага зьместу.

### ІНСТЫТУТ МОРСКАЙ ВАЙНЫ

ВАРШАВА, 12. Як паведамляе «Газэта Польска», у Гдыні (ваенна-морскі порт, які пабудаваны на Бальтыцкім узьбярэжжы) арганізуецца інстытут для падрыхтоўкі кіраўнікоў вайны на моры.

Гэты інстытут знаходзіцца пад непасрэдным кіраўніцтвам польскага прэзыдэнта.

## Правакацыйныя весткі нанкінскага агенцтва

ШАНХАЙ, 10. Агенцтва Го-мінь паведамляе, што ў Харбіне працягваюцца перагаворы адносна надыходзячай канфэрэнцыі. Як падае агенцтва — паводле сапраўдных вестак, абодва бакі згодны пайсьці на ўступкі.

## Абвяржэньне ТАСС

ТАСС упоўнаважаны абвяргнуць паведамленьне, як не адпавядаючае сапраўднасьці, аб некіх перагаворах, якія датычацца савецка-кітайскай канфэрэнцыі, быццам, адбываюцца ў Харбіне. Як вядома, усе папярэднія пытаньні, якія датычаць канфэрэнцыі, поўнасьцю ўрэгуляваны хабараўскім пратаколам, абавязковасьць якога аднолькава прызнана як СССР, так і Мукдэнам, і ніякіх перагаворы, апрача надыходзячай канфэрэнцыі ў Маскве, натуральна, мець месца ня могуць.

# ПРАЦЭС „СВУ“

## Прамова грамадзкага абвінаваўцы—пісьменьніка Сьлісарэнкі

ХАРКАЎ, 12. На працэсе «СВУ» пасьля грамадзкага абвінаваўцы тав. Любчанкі выступіў другі грамадзкі абвінавайца—**пісьменьнік Сьлесарэнка.**

— Значэньне працэсу—сказаў ён—заключаецца ў тым, што ён адбываецца ў момант найбольшага напружаньня будаўніцтва сацыялізму на Украіне і ва ўсім Саюзе, у момант абвастрэньня клясавае барацьбы. Сваю контр-рэвалюцыйную работу «СВУ» разьлічваў прыкрыць нацыянальным сьцягам—патрабаваньнем фальшывай «самастойнасьці» Украіны, аднак, у сапраўднасьці гэта быў толькі фігавы лісток, і калі на судзе сарвалі гэты фігавы лісток «самастойнасьці», дык адкрыўся ўвесь твар клясавага ворага, твар **ваяўнічага кантр - рэвалюцыйнага кулацтва, у авангардзе якога ішла нацыянал-ліставская буржуазная інтэлігенцыя.**

На судзе высьветлілася, што пасьля Кастрычніка цэнтр імкненьняў украінскае буржуазнае інтэлігенцыі—усіх тых акадэмікаў, прафэсароў і папоў, якія сходзіліся ў «СВУ», заключаўся зусім **ня ў вырашэньні культурна-нацыянальных пытаньняў, а ў зьвяржэньні савецкае ўлады, у рэставрацыі ва што-б та ні стала буржуазнага ладу на Украіне.** Такім чынам, **вы судзіце тут агентаў кулака, памешчыка і папа.** Вы судзіце **агентаў міравой рэакцыі, якая прабавала павярнуць назад калясо гісторыі.**

Грамадзкі абвінаваўца зазначае, што члены «СВУ» гатовы былі абярнуць Украіну ў «сырцовы дадатак суседнім дзяржавам», каб толькі пазбавіцца ад савецкае ўлады. Яфрэмаўцы нічога ня мелі супроць таго, каб **прадаць інтарэсы шырокіх украінскіх мас і нават украінскую культуру польскай, рускай або якой-небудзь іншай буржуазіі, абы толькі зьвяргнуць уладу рабочых і сялян. Яны былі ня толькі вогагамі савецкага ладу, але і украінскае культуры. «СВУ» прабаваў зрабіць украінскую культуру падгалоскам польскае і рускае культуры. Эканамічна Украіна паводле праграмы «СВУ» павінна была стаць сырцовай базай Польшчы і інш. дзяржаў.**

Шырокае будаўніцтва украінскае пралетарскае культуры, дзесяткі тысяч украінскіх школ, тэатры, кнігі—усяго гэтага ня хоча бачыць асьцярвянелы кулак і яго агенты. **За свае дзесяцінкі ён гатоў прадаць ня толькі Галіцыю, Букавіну, Закарпацьце, але і ўсю Украіну.** абярнуцца нават у мала-валаха, або ў мала-румына, толькі-б яго хутар быў адгароджаны высокім тынам і быў някранутым.

### Хроніка судовага працэсу

ХАРКАЎ, 12. Пасьля грамадзкага абвінаваўцы, пісьменьніка Сьлесарэнка, выступіў грамадзкі абвінаваўца—акадэмік **Сакалоўскі.**

Затым выступіў прадстаўнік дзяржаўнага абвінавачаньня **тав. Міхайлік,** намесьнік пракурора Вярхоўнага Суду **тав. Ахматаў,** кіеўскі акруговы пракурор **тав. Выструкоў** і пракурор Наркамюста тав. Яхімішын. Сёньня пачнуцца прамовы абароны.

### АДМЯЖОЎВАЮЦЦА АД КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ЗГРАІ

КІЕЎ, 12. Агульны сход членаў мэдыцынскае сэкцыі пры ўсеукраінскай акадэміі навук рашуча адмяжоўваецца ад контр-рэвалюцыйнае зграі былых членаў сэкцыі, зараз падсудных па справе «СВУ». Пастаноўлена ўсіх іх выключыць з сэкцыі.

# ЯК ІДЗЕ СЯЎБА

## Калгасы--наперадзе

ЗАПАРОЖЖА. Раньняя сяўба скончылася поўнасьцю. Плян засеву раньніх яравых выкананы на 103 проц., плян засеву ішаніцы выкананы на 133 проц. Супроць мінулага году ішаніцы засеена 138 проц. Калгасамі засеена 104 проц., індывідуальнымі гаспадаркамі — 100 проц. пляну. Прыступлена да сяўбы позьніх культур. Пакуль засеена 15 процантаў. Умовы сяўбы спрыяючыя. Яравыя ўсходы здавальняючыя.

АДЭСА. Да 5-га красавіка засеяна раньніх яравых калгасамі 101 проц., індывідуальнікамі — 84. У апошнія дні ідуць дажджы.

МІКАЛАЕЎ. Сяўба раньніх збожжавых на плошчы 220 тыс. гэкт. калгасамі скончана. Ішаніца пасеена выключна радавымі сеялкамі. Індывідуальныя гаспадаркі сяўбу ўжо канчаюць. Сяўба падсоляечніка праведзена на плошчы 10 тыс. гэкт. і затрымана дажджом. Ствараецца пагроза сяўбе з прычыны недахвату фуражу.

**Ціхарэцкая, (Кубанская акруга).** Сяўба збожжавых культур у Ціхарэцкім раёне скончана. Плян выкананы з вялікім перавышэньнем. Прыступлена да засеву прапашных культур. Палявыя работы праходзяць у парадку спаборніцтва і ўдарніцтва. Усе калгасы ў раёне перайшлі на статут арцелі. У баку ад сяўбы стаіць станічная каапэрацыя. Каапэратывы дрэнна забясьпечваюць калгасьнікаў прадуктамі. Адчуваецца востры недахват у кармох.

## Здавальняючы ход ангельска-савецкіх перагавораў

ЛЕНДАН, 11. Усе газэты публікуюць паведамленьне Савецкага прадстаўніцтва ў Лёндане аб становішчы ангельска-савецкіх перагавораў адносна гандлёвага дагавору. Як зазначаецца ў паведамленьні, перагаворы гэтыя разгортваюцца настолькі здавальняюча, што можна лічыць поўным заключэньне ў бліжэйшы час канчатковага паразуменьня.

# Партыйныя масы цалкам і поўнасьцю ўхваляюць пастановы пленуму ЦК

## ВІЦЕБСКІ ПАРТАКТЫЎ АБ ВЫНІКАХ САКАВІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

Віцебскі партактыў па дакладу тав. **Гантмана** аб выніках сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б прыняў рэзалюцыю, у якой поўнасьцю ўхваліў «усе пастановы пленуму, накіраваныя на пасьпяховае выкананьне дырэктыў партыі па сацыялістычным будаўніцтве, на рашучае выпраўленьне памылак і скрыўленьняў лініі партыі, якія мелі месца ў практыцы калгаснага будаўніцтва».

Партактыў цалкам і поўнасьцю далучыўся да пастаноў сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б і адзначыў, што «посьнехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і прамысловага будаўніцтва зьяўляюцца вынікам цьвёрдага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і лепшым адказам ныцікам і дэзэртырам з фронту сацыялістычнага будаўніцтва — правым апартуністым».

Актыў рашуча асудзіў дапушчаныя ў радзе месц грубыя скажэньні і перагібы ў практыцы калгаснага будаўніцтва.

— Ня гледзячы на выразныя дырэктывы ЦК УсеКП(б), ЦК і АК КП(б)Б—гаворыцца ў рэзалюцыі — у радзе месц груба парушаўся прынцып добраахвотнасьці пры арганізацыі калгасаў. У гэтых мясцох панавала практыка прымусу, грубое адміністраваньне, прымусовае абагуленьне маемасьці як калгасьнікаў, так і некалгасьнікаў, нават абагуленьне птушкі і прадуктаў харчаваньня, выпадкі ападатканьня сераднякоў у індывідуальным парадку, пазбаўленьне іх права голасу і г. д. Усе гэтыя перагібы, скажэньні і галавацяпствы, якія нічога агульнага з лініяй партыі ня маюць, дыскрэдытавалі ў гэтых мясцох ідэю калектывізацыі, зьяўляліся простай дапамогай кулацтву ў яго палёнай барацьбе супроць калгаснага руху і давалі повад правым апартуністым для новых спроб атакаваць генэральную лінію партыі.

Актыў, падкрэсьліўшы, што «далейшае замацаваньне калгаснага будаўніцтва і ліквідацыя кулацтва, як класы, на базе суцэльнае калектывізацыі, немагчымы без рашучага і неадкладнага выпраўленьня памылак і скажэньняў лініі партыі», заклікаў усю партыйную арганізацыю рашуча, пабальшавіцку выправіць дапушчаныя памылкі і перагібы. Актыў заклікаў партыйную арганізацыю да бязьлітаснай барацьбы з правым ухілам — галоўнай небясьпекай і «левымі» загібамі за поўнае выкананьне пастаноў пленуму ЦК аб калгасным будаўніцтве, аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і выкананьні прамфінпляну. Актыў падкрэсьліў, што партыйная арганізацыя павінна шырока прапрацаваць апошнія пастановы ЦК УсеКП(б), артыкулы тав. Сталіна і пастановы пленуму ЦК КП(б)Б, пасьлядоўна праводзячы задачы, паказаныя ў гэтых палітычных дакумантах.

## ШПАРКА І РАШУЧА ВЫПРАВІЦЬ ПЕРАГІБЫ І СКАЖЭНЬНІ

Актыў **Аршанскай** партарганізацыі, заслухаўшы даклад тав. **Грысевіча** аб выніках сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, цалкам і поўнасьцю ўхваліў усе пастановы пленуму і далучыўся да іх.

Ва ўхваленай рэзалюцыі актыў падкрэсьліў што «буйныя посьнехі партыі па індустрыялізацыі краю і калектывізацыі сельскае гаспадаркі дасягнуты на аснове жорсткай барацьбы з правапартуністычным ухілам, як з галоўнай небясьпекай, і з «левымі» загібамі, на аснове шырокай мабілізацыі рабочае клясы і батрацка - бяднацка - серадняцкіх мас на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі».

Актыў завастрыў увагу ўсёй партыйнай арганізацыі на патрабе рашуча выправіць грубыя памылкі, перагібы і скажэньні лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, дапушчаныя ў радзе месц акругі. Актыў заклікаў партыйную арганізацыю да наглыбленай прапрацоўкі і выкананьня задач, паказаных у апошніх пастановах ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб калгасным будаўніцтве і артыкулах тав. Сталіна.

Партактыў падкрэсьліў, што партыйная арганізацыя павінна няўхільна ўзмацняць жорсткую барацьбу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і з «левымі» загібамі, якія льлюць ваду на млын правага апартунізму.

Адзначыўшы нездавальняючы ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы на Аршанскай акрузе, актыў заклікаў партарганізацыю максымальна ўзмацніць тэмпы работы па падрыхтоўцы да сяўбы.

Сход партактыву, адзначыўшы рад дасягненьняў у прамысловым будаўніцтве ў акрузе, падкрэсьліў нездавальняючы ход выкананьня прамфінпляну на прадпрыемствах акругі. Партыйны актыў завастрыў увагу партарганізацыі на патрабе ўзмацніць барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

## Магілеўскае парткіраўніцтва прызнае свае памылкі

### З пастановы бюро Магілеўскага АК КП(б)Б

Бюро **Магілеўскага** АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК на аб'яднаным пасяджэньні абмеркавалі пытаньне аб памылках і асобных прарывах у **Магілеўскай** партарганізацыі.

Бюро АК і прэзыдыум АКК падкрэсьлілі, што побач з сапраўднымі посьпехамі па калгасным будаўніцтве ў акрузе, з боку некаторых членаў партыі, ячэек і раённых партарганізацый пры правядзеньні калектывізацыі дапускалася самае шкоднае скажэньне лініі партыі. Гэта скажэньне заключалася ў парушэньні прынцыпаў добраахвотнасьці ў калгасным будаўніцтве, у гвалтоўным абагуленьні маемасьці і г. д. Некаторыя члены партыі і нават асобныя партыйныя ячэйкі сваю работу па калгасным будаўніцтве праводзілі галоўным чынам мэтадамі адміністраваньня і націску. Былі дапушчаны грубыя перагібы ў адносінах да серадняка: раскулачваньне часткі серадняцтва, пазбаўленьне выбарчых правоў і г. д.

Ва ўхваленай пастанове па гэтым пытаньні бюро АК і прэзыдыум АКК рашуча асудзілі дапушчаныя перагібы і скрыўленьні, якія зьяўляюцца простай дапамогай кулацтву ў яго шалёнай барацьбе супроць калгаснага руху. Бюро АК і прэзыдыум АКК прызналі, што яны нерашучa, а часамі несвая́часова змагаліся з перагібамі і скрыўленьнямі партлініі ў калгасным будаўніцтве. У свай пастанове бюро АК і прэзыдыум АКК **прызналі** гэтыя памылкі і зрабілі рад арганізацыйных выводаў. Падамо некаторыя вытрымкі з гэтае пастановы.

«Памылкай бюро АК КП(б)Б і прэзыдыуму АКК зьяўляецца тое, што яны не даволі рашуча, а часамі і несвая́часова, рэагавалі на гэтыя скрыўленьні партлініі, не мабілізавалі наўкола канкрэтных фактаў належным чынам увагу партарганізацыі на барацьбу са скрыўленьнямі ў калгасным будаўніцтве, не папярэджвалі гэтых памылак.

— Студзеньскі пленум АК КП(б)Б, разам з выразнымі і правільнымі дырэктывамі аб далейшай работе партарганізацыі па калгасным будаўніцтве, дапусьціў палітычную памылку, даўшы ўстаноўку — разам з ліквідацыяй кулацтва, як класы, — на ліквідацыю і «новай буржуазіі», як клясы Гэта распаўсюджаньне лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, на ліквідацыю новай буржуазіі не адпавядае ўстаноўцы партыі.

— Бюро АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК лічаць, што бюро АК дапусьціла памылку ў тым, што несвая́часова мабілізавала партарганізацыю на барацьбу з грубейшымі скрыўленьнямі палітыкі партыі. Гэта вывялася ў тым, што за пэрыяд з 4 па 11 сакавіка бюро АК КП(б)Б не прыняло пастановы ў адпаведнасьці з артыкулам тав. Сталіна і апублікаваным новым статутам с.-г. арцелі.

— Бюро АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК лічаць правільнай пастанову ЦК КП(б)Б, які паставіў на від бюро АК КП(б)Б за несвая́часовае рэагаваньне на праваапартуністычную пастанову бюро **Шкловскага** райкому партыі. Разам з гэтым, бюро АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК таксама прызнаюць, што ў пастанове бюро Магілеўскага АК КП(б)Б аб становішчы **Крычаўскай** арганізацыі ня было дана палітычная ацэнкі фактам і перагібам, якія мелі месца ў райпартарганізацыі, ня была рашуча асуджана нездавальняючая работа партарганізацыі па барацьбе з правым і «левым» апартунізмам. У выніку бюро АК КП(б)Б фактычна змазвала перагібы і скрыўленьні ў Крычаўскай арганізацыі, не мабілізавала партыйных мас на выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б, чым **дапусьціла палітычную памылку.** Бюро АК і прэзыдыум АКК прызналі, што арганізацыйныя меры, ухваленыя ў адносінах да кіраўнікоў Крычаўскай партарганізацыі, зьяўляюцца невыстарчальнымі».

Бюро АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК зьнялі з работы сакратара **Крычаўскага** райпарткому **Грынглаза** і старшыню РВК **Кандраценку.** За антыпартыйныя, праваапартуністычныя выступленьні на Крычаўскім райпартсходзе прыцягнуты да адказнасьці партыйцы **Вертпіб, Кічоў, Лаўрэнаў,** якія да гэтага часу на прызналі памылковасьці і шкоднасьці сваіх выступленьняў. У Крычаў камандуецца прадстаўнік бюро АК і прэзыдыуму АКК для растлумачэньня арганізацыі суткасьці дапушчаных памылак.

Бюро АК і прэзыдыум АКК прызналі, што пастанова Чэрыкаўскай райпартарганізацыі, прынятая на раённым сходзе 14 сакавіка, зьяўляецца антыпартыйнай, праваапартуністычнай пастановай. Бюро АК і прэзыдыум АКК адзначылі грубую памылку сакратара Магілеўскага АК тав. **Нэйланда,** дапушчаную ім у гэтай справе. Тав. Нэйланд прысутнічаў на раённым партактыве Чэрыкаўскай арганізацыі, які адмежаваўся і асудзіў антыпартыйную пастанову райпартсходу. Але тав. Нэйланд не далажыў бюро АК КП(б)Б аб гэтых пастановах і не патрабаваў ад Чэрыкаўскага райкому партыі скліканьня па-зачарговага райпартсходу для скасаваньня і выпраўленьня ўхваленай антыпартыйнай пастановы.

Бюро АК і прэзыдыум АКК **распусьцілі** бюро **Чэрыкаўскага** райкому. Сакратар РК **Бурдзілаў** зьняты з работы з абвяшчэньнем вымовы. Тэрмінова склікаецца райпартсход для перавыбараў райкому.

Бюро АК КП(б)Б і прэзыдыум АКК, разам з прызнаньнем сваіх памылак і іх выпраўленьнем адзначылі, што, ня гледзячы на рашучыя меры, прынятыя за апошні час АК і АКК па барацьбе з скрыўленьнямі партлініі ў калгасным будаўніцтве, з праваапартуністычнымі зьявамі і «левымі» загібамі — у асобных зьвеньнях партарганізацыі яшчэ няма сапраўднага бальшавіцкага рашучага выпраўленьня дапушчаных памылак.

Бюро АК і прэзыдыум АКК—гаворыцца ў пастанове — катэгарычна патрабуюць бязьлітаснай барацьбы з тымі членамі партыі, якія не жадаюць праводзіць правільнай лініі партыі і не адмаўляюцца і не выпраўляюць сваіх памылак.

Бюро АК і прэзыдыум АКК заклікалі партыйную арганізацыю разгарнуць баявую бальшавіцкую работу па выкананьні апошніх дырэктыў партыі па калгасным будаўніцтве і задач, паказаных у артыкулах тав. Сталіна, пасьлядоўна ўзмацняючы барацьбу з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай і «левымі» загібамі.

## Аб ходзе перавыбараў парт'ячэек

### Пастанова бюро Кастрычніцкага РК КП(б)Б

Заслухаўшы інфармацыю арг. аддзелу РК КП(б)Б, даклады асобных парт'ячэек і судаклады членаў РК КП(б)Б, якія былі прымацаваны да парт'ячэек аб ходзе перавыбараў бюро парт'ячэек, бюро РК КП(б)Б адзначае:

1. Справаздачна - перавыбарчая кампанія парторганаў на раёне ў некаторых парт'ячэйках ня была скарыстана для большага павялічэньня якасьці партыйнага кіраўніцтва, далейшага замацаваньня сувязі партыйных ячэек з пралетарскімі масамі і мабілізацыі рабочых мас вакол галоўнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

У выніку гэтага былі дапушчаны ў некаторых парт'ячэйках фармальныя адносіны, як у падрыхтоўчай рабоце, так і ў часе перавыбараў партбюрганаў у гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Асабліва недапушчальным зьявішчам РК лічыць тое, што ячэйкі КП(б)Б вагонных майстэрань і ДЭПО папярэдня не абгаварылі на ячэйках з удзелам рабочых ліст ЦК КП(б)Б, не рабілі на рабочых сходах дакладаў аб рабоце парт'ячэек, не скарыстаўшы пасьценгазэты для асьвятленьня вынікаў работы, недахопаў і прапаноў аб рабоце парт'ячэек.

РК таксама лічыць зусім недапушчальным зьявішчам тое, што дапушчаныя палітычныя памылкі бюро РК КП(б)Б па пытаньнях заціску самакрытыкі, парушэньня ўнутры - партыйнай дэмакратыі ня былі з усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю абгавораны і ліквідаваны, а, наадварот, былі спробы (ячэйка вагонных майстэрань) змазаць іх палітычную сутнасьць.

Выходзячы з гэтага, бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За слабую падрыхтоўку да перавыбараў бюро і няўважлівы адносіны да дырэктыў ЦК, АК і РК КП(б)Б аб разгортваньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў — былому складу бюро парт'ячэек вагонных майстэрань і ДЭПО абвясьціць вымову і ў часе правядзеньня рэарганізацыі структуры партыйных органаў на чыгунцы пераабраць бюро ячэек вагонных майстэрань і ДЭПО, запрапанаваўшы зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу па справаздачнай кампаніі перавыбараў ячэек на падставе ліста ЦК, дырэктыў АК і РК КП(б)Б, ставячы мэтай большае прыцягненьне беспартыйных рабочых да ўдзелу ў перавыбарах парторганаў.

2. Паказаць членам РК КП(б)Б як на недапушчальнае зьявішча, калі яны са значным спазьненьнем паведамляюць РК КП(б)Б аб наяўнасьці недахопаў, якія маюць месца ў тых парторганах, да якіх яны былі прымацаваны на час справаздачна - перавыбарчай кампаніі органаў КП(б)Б.

3. Даручыць аддзелу склікаць нараду сакратароў тых парт'ячэек, дзе яшчэ не праведзены перавыбары для абгаварэньня аб свая́часовым выпраўленьні недахопаў у іх падрыхтоўчай рабоце, улічваючы, у першую чаргу, вышэйпаказаныя памылкі.

# Узмоцнім пралетарскае шэфства над вёскай

## Дапамагчы арганізацыйнай і вытворчай працы ў калгасах, перадаць ім практыку калектыўнай работы фабрык і заводаў—такія першачарговыя задачы шэфскіх арганізацый

## На рэйкі масавасьці

Пастаўленая тав. Леніным у 1923 годзе задача разьвіцьця сувязі паміж рабочымі і працоўнымі сялянамі праз шэфства зьяўляецца ў сучасных умовах адной з важнейшых задач рабочае клясы, якая змагаецца за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Масавы рух бяднякоў - серадняцкіх мас сялянства за арганізацыю калектыўнае гаспадаркі пацьвярджае вынікі праведзенай работы рабочаю клясаю ў вёсцы, пад кіраўніцтвам свайго авангарду — УсеКП(б). Шэфства рабочых фабрык і заводаў у гэтай справе адыграла вялікую ролю. У сучасны пэрыяд нас ня можа задаволіць тая работа, якая вялася таварыствамі да гэтага часу. Пасылка рабочых брыгад у вёску, пасылка 25.000 рабочых на стацыю працу ў калгасы — усё гэта новыя формы змычкі рабочае клясы з бяднякоў-серадняцкімі масамі сялянства, але гэта ні ў якім разе ня зьнімае з парадку дня пытаньня аб паладжаньні і ўзмацненьні штодзённай сувязі рабочых з вёскай праз шэфскія таварыствы.

Дапамагчы паладзіць арганізацыйную і вытворчую працу ў арганізаваных калгасах, перадаць практыку калектыўнае працы на фабрыках і заводах калгасам, узмацняць далейшую калектывізацыю сельскае гаспадаркі—першачарговыя задачы ў рабоце шэфскіх арганізацый на вёсцы.

У сувязі з разгортваньнем калгаснага руху паўстае задача ня толькі зьмяніць формы і мэтады шэфскае работы, а патрэбна перагледзець і зьмест работы. Калі да гэтага часу шэфтаварыствамі зварачалася больш увагі на агітацыйную працу ў вёсцы, дык зараз, побач з агітацыйнай працай, паўстае ва ўсю шырыню задача практычнай дапамогі калгаснаму будаўніцтву.

Некаторая спроба перабудаваць шэфскую работу ўжо праведзена па Менскай акрузе. Некалькі прадпрыемстваў аднаго саюзу бяруць шэфства над цэлым (адміністрацыйным) раёнам. Да гэтых-жа прадпрыемстваў далучаюцца культуратовы (школы, бальніцы і г. д.). Шэфствам-жа кіруе адно з буйнейшых прадпрыемстваў, праз так званае куставое аб'яднаньне. Рабіць вынікі з гэтай спробы яшчэ рана, але адно можна адзначыць, што гэтая форма дала магчымасьць больш шырока ўцягнуць рабочыя масы ў справу сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, спыніла гастралёрскія выезды шэфаў у вёску, узмацніла ўдзел прафсаюзных арганізацый у шэфскай рабоце.

XVI канфэрэнцыя УсеКП(б) у сваёй пастанове па дакладу тав. Калініна паказала: «У гэтых мэтах бязумоўна неабходна падняць і ўзмацніць работу шэфскіх таварыстваў, перайсьці да ствараньня раду добраахвотных аб'яднаньняў (і партыйных, і прафэсыянальных і ўсякіх іншых фабрычна-заводзкіх), ставячых сваёй задачай сыстэматычную дапамогу вёсцы ў яе сацыялістычным разьвіцьці».

Выходзячы з гэтае пастановы, неабходна зараз-жа вырашыць пытаньне аб арганізацыі рабочых т-ваў па садзейнасьці калектывізацыі сельскае гаспадаркі, бо яны фактычна пачалі ўжо ўзьнікаць (Менск), але да гэтага часу канчаткова ня вырашаны формы гэтай арганізацыі.

В—ч.

## Друкары ў барацьбе за калектывізацыю

Менскія прадпрыемствы **саюзу друкароў** шэфствуюць над Халопеніцкім раёнам. Цэнтральнае праўленьне саюзу друкароў разгарнула вялікую растлумачальную работу сярод рабочых-друкароў. Пры ЦП саюзу створана куставое бюро таварыства з 15 асоб па садзейнічаньні калектывізацыі.

У клюбе друкароў былі праведзены тры агульна-саюзныя вечары, прысьвечаныя калектывізацыі і падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

З 10-га лютага ў Халопеніцкім раёне працуе выязная друкарня, дзе яна прабудзе да 20-га красавіка. У склад брыгады друкарні ўвайшлі тры наборшчыкі, адзін друкар, доктар і два журналісты. Выпушчана 10 нумароў газэты «За Калектывізацыю». Брыгада друкарні карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод сялянства. Штодзённа ў друкарню прыходзяць па ўсялякія парады.

Акрамя работы ў друкарні брыгадзіры выяжджалі ў раён, дзе праводзілі сходы сялян па пытаньні арганізацыі калгасаў. Таксама былі высланы яшчэ тры брыгады з рабочых друкарні ВДВ і БАН, тэрмінам на тры тыдні, у складзе 15 чал.

Па ініцыятыве брыгады ў раённым цэнтры адкрыта культурная чайная і габінэт па зубных хваробах.

Р.

## РЭАРГАНІЗАВАЛІ РАБОТУ

Шэфскія арганізацыі гор. Менску рэарганізавалі зараз сваю работу на вёсны. Створаны рабочыя бюро садзейнасьці калектывізацыі, прафарганізацыі ўзяліся за канкрэтную гаспадарчую дапамогу вёсцы.

Вялікую працу выканалі менскія **асьвятнікі.** Яны за час падрыхтоў

*Да гадавіны сацспаборніцтва*

# Спэцыялістыя, уключайцеся ў самаправерку!

## Дапамажэце давесьці прамфінплян да кожнага рабочага

**УСІМ ПРАФОРГАНАМ І ІТС!**

Праверка выкананьня гаспадарча-палітычных дагавароў сацспаборніцтва, выкананьня прамфінпляну за першае паўгодзьдзе, падагуленьне гадавых вынікаў сацспаборніцтва маюць вялізарнейшае палітычнае значэньне ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Праверка дае шырокія магчымасьці разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, у саблівасьці там, дзе да гэтага часу яшчэ не ахоплены поўнасьцю шырокія рабочыя масы, дае поўную магчымасьць накіраваць усе сілы на ліквідацыю прарыву па выкананьні прамфінпляну, на давядзеньне пляну да цэхаў, агрэгатаў і кожнага рабочага.

ЦСПСБ, ВСНГБ і ЛКСМБ прыступілі да выкананьня гэтай вялізарнай задачы, вылучыўшы актыўных работнікаў і накіраваўшы іх на прадпрыемствы для правядзеньня гэтай работы.

Паводле дырэктыў ЦСПСБ, на прадпрыемствах для правядзеньня праверкі створаны ўдарныя рабочыя брыгады, якія ўжо разгарнулі сваю работу.

БелМБІТ вылучыў з актыву інжынэрна-тэхнічных работнікаў рад таварышоў для правядзеньня гэтай работы, прымацаваўшы іх да больш буйных прадпрыемстваў гораду Менску. Прымацаваныя інжынэрна-тэхнічныя работнікі ўліваюцца ў брыгады ЦСПСБ на прадпрыемствах і вядуць усю работу, уцягваючы ў брыгады інжынэрна-тэхнічных работнікаў, якія працуюць на прадпрыемствах.

На мясцох інжынэрна-тэхнічныя работнікі і інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі да гэтага часу не прыступілі да правядзеньня гэтай вялікай задачы, а па некаторых прадпрыемствах нават ня вылучаны інжынэрна-тэхнічныя работнікі ў брыгады ЦСПСБ і не прыступлена да гэтай работы. БелМБІТ прапануе ўсім ІТС і ІТР тэрмінова прыступіць да гэтай работы, прымацаваць з ліку актыву сваіх членаў да прадпрыемстваў, уліць іх у брыгады ЦСПСБ, уцягнуць усіх інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў у праверку.

Бюро ІТС павінны быць у курсе работы вылучаных інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, для чаго рэкамандуецца за слухоўваць інфармацыі прымацаваных ІТР.

Неабходна наладзіць жывое кіраўніцтва і сувязь з прадпрыемствамі. Усім бюро ІТС прапануецца інфармаваць МБІТ аб выніках удзелу ў гэтай работе і кожнасьці вылучаных членаў ІТС.

Пасьля сканчэньня гэтай работы бюро ІТС складаюць інфармацыйную справаздачу аб праробленай рабоце.

Усім ЦП саюзаў, акрпрафбюро і фабзавмясцкомам прапануецца праверыць выкананьне ІТС дырэктывы МБІТ аб удзеле і актыўнасьці ІТР у праверцы сацспаборніцтва і інфармаваць ЦСПСБ.

Старшыня ЦСПСБ РЫЖОЎ.
Нам. старшыні БелМБІТ ГЕНЭРАЛАЎ.

# Актыўны ўдзел ІТР—лепшы паказальнік салідарнасьці з рабочай клясай

Разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва ахапіле ўсе большыя пласты рабочых мас. Ударныя брыгады злучаюцца ва ўдарныя групы і ўдарныя фабрыкі і заводы. Рабочая кляса шляхам ударніцтва і сацспаборніцтва паскарае тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, завяршаючы сваю перамогу над капіталістычнымі элемэнтамі ў краі.

У сучасны момант рабочая кляса падагульвае гадавыя вынікі сацспаборніцтва, праводзіць праверку выкананьня прамфінпляну за першае паўгодзьдзе, высоўваючы новыя формы ў выкананьні намечаных задач, у давядзеньні пляну да цэхаў, агрэгатаў і асобных рабочых.

Праверка і ўся работа павінна прыцягнуць увагу усёй пралетарскай грамадзкасьці. Пад агонь самакрытыкі трэба ўзяць прычыны прарываў і недахопы ў рабоце нашых прадпрыемстваў. У гэтай важнейшай задачы не апошнюю ролю павінны адыграць інжынэрна-тэхнічныя работнікі.

Рабочаму патрэбна тэхнічная, арганізацыйная дапамога. Такую дапамогу могуць і павінны даваць інжынэрна-тэхнічныя работнікі, непасрэдна праяўляючы сваю ініцыятыву і энэргію ў сацспаборніцтве, у выкананьні прамфінпляну і давядзеньні прамфінпляну да цэху, агрэгату і рабочага.

Актыўны ўдзел у гэтай справе ІТР будзе лепшым паказьнікам салідарнасьці з рабочай клясай у будаўніцтве сацыялізму, будзе лепшым паказьнікам выкананьня абяцаньняў інжынэрна-тэхнічных работнікаў у сваёй адданасьці справе рабочае клясы.

Намесьнік старшыні БелМБІТ
Генэралаў.

# „Молот" пачынае праверку

**На чыгуначным вучастку ст. Віцебск арганізавана вузлавая часовая кантрольная камісія, якой даручана праверыць работу ўдарных брыгад і выкананьне сацдагавораў.**

**ДРУКАВАНАЯ ГАЗЭТА ДЭПО ВІЦЕБСК «МОЛОТ» паведамляе, што вынікі першага кварталу кажуць аб тым, што прамфінплян дэпо НЯ ВЫКАНАНЫ. Вучастковы камітэт і мясцкомы не арганізавалі, як належыць, сацспаборніцтва і НЕ КІРАВАЛІ ІМ. Адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал застаўся ў баку ад сацспаборніцтва. Партарганізацыя не мабілізавала актыўнасьці рабочых мас вакол асноўных пытаньняў выкананьня вымяральнікаў. Такой рабоце трэба пакласьці канец.**

**«Молот» заклікае рабочых дэпо зрабіць праверку сацспаборніцтва МАСАВАЙ, выявіць інжэнэрнікаў і ліквідаваць прарывы па выкананьні прамфінпляну.**

## Агляд калгасных газэт

# Змагары на фронце калектывізацыі*)

«Ленінскі Шлях» газэта Слуцкага раёну суцэльнай калектывізацыі) пачала выходзіць з 23 сакавіка. Перадавы артыкул першага нумару «Замацуем калгаснае будаўніцтва» прысьвечаны пытаньню аб скажэньнях партыйнай лініі. Газэта на канкрэтных фактах выкрывае контр-рэвалюцыйную хлусьню кулацтва аб калгасах, і заклікае, беднату, батрацтва і серадняку шчыльна згуртавацца вакол партыі.

У газэце ёсьць аддзелы: «Як арганізаваць пробныя выезды ў поле», «Арганізаваць батрацтва і беднату», «Арганізацыя працы ў калгасах—адна з асноўных задач дня».

Першы нумар газэты «Трактар» (Койданаўскага раёну суцэльнай калектывізацыі) выйшаў 28-га сакавіка. Перадавы артыкул прысьвечаны зьніштэньню размычкі паміж колькаснымі і якаснымі паказальнікамі калгаснага будаўніцтва. Артыкул правільна арыентуе чытача ў чарговых задачах калгаснага будаўніцтва.

Газэта дае вялікі аддзел «Гураганны агонь на апартуністых», які асьвятляе пытаньне слабое работы паасобных ячэек з батранка-бядняцкімі групамі і слабога ўдзелу камсамольскіх арганізацый у калгасным будаўніцтве. Газэта завяла спэцыяльны аддзел «Парушальнікі працоўнай дысцыпліны—шкоднікі калектывізацыі». У гэтым аддзеле зьмешчаны допісы аб калгасьніках, якія падбайна адносяцца да даручанай работы.

У газэце ёсьць добрыя аддзелы «Новы закон аб с.-г. падатку» і «Наладзіць культурнае абслугоўваньне калгасьнікаў».

Зараз пакалькі агульных заўваг. Усе газэты маюць адзін вялікі недахоп—пераважае матар'ям агульна-раённага парадку, а часамі нават і агульнасаюзнага. Гэта тлумачыцца тым, што газэты яшчэ не пасьпелі абрасьці кадрамі калгаскораў.

Газэты не асьвятляюць становучай практыкі лепшых калгасаў і не даюць канкрэтнага растлумачэньня асноўным пытаньням, якія хвалююць калгасьніка: як павінна быць арганізавана вытворчасьць, сяўба і г. д. Аб усім гэтым газэты, праўда, пішуць, але пішуць абстрактна, урыўкавы, агульна.

Газэты «Камунар», «Трактар» і «Ленінскі Шлях» зьмяшчаюць радыё-тэлеграмы аб апошніх падзеях за мяжою. Гэтыя тэлеграмы пры выходзе газэт адзін раз на тыдзень маюць урыўкавы характар і ня могуць даць чытачу поўнага ўяўленьня міжнароднага становішча. Атрымліваецца, што каля 200 радкоў траціцца марна. Таму лепш за ўсё не даваць радыё-тэлеграм, а па магчымасьці зьмяшчаць папулярныя агляды а пытаньнях міжнароднага і ўнутранага становішча за тыдзень.

Некалькі слоў аб асноўных задачах газэт на бліжэйшы час.

Уся ўвага іх зараз павінна быць накіравана на арганізацыю працы ў калгах.

Стварыць моцнае плянавае гаспадарчае кіраўніцтва і прывучыць учарайшняга ўласьніка - гаспадара да дысцыпліны калектыву, зрабіць яго калектывістым-гаспадаром—вось аснова ўсёй задачы.

Газэты павінны шырока папулярызаваць адказы калгасьнікам т. Сталіна, пастанову ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам і калгасьнікам, змаганцу з усякімі скажэньнямі лініі партыі ў справе калектывізацыі.

Трэба паставіць сыстэматычнае асьвятленьне ходу выкананьня я вытворчых пляноў (такасама як і на фабрыцы асьвятляецца ход выкананьня прамфінпляну), давесьці плян да кожнага калгасьніка і дабіваецца сьвядомага выкананьня яго. Трэба праз газэты змагацца за выкананьне пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб пашырэньні пасеўнай плошчы на 12 проц.

Газэты павінны арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва на сваіх старонках, канкрэтна паказваючы прычыны адставаньня паасобных калгасаў, прыклады добрай працы, выносіць на газэтныя шпальты дэзарганізатараў вытворчасьці, парушальнікаў працоўнай дысцыпліны.

Вельмі карысна было-б у калгасных газэтах завесьці аддзел запытаньняў і адказаў. У калгасьнікаў ёсьць шмат нявысьветленых пытаньняў, на якія на месцох яны часта ня могуць атрымаць поўнага адказу

Адначасова газэты не павінны ні на хвіліну спыняць мабілізацыю батрацка-бядняцкіх мас вакол чарговых задач узмацненьня калгасаў, выкрываць в усёй рашучасьцю махінацыі кулацтва і падкулачнікаў, змагацца за ачыстку калгасаў ад варожых элемэнтаў.

Газэтам трэба разгарнуць работу па ўцягненьні ў рады калгаскораў лепшых калгасьнікаў.

Уся гэта работа патрабуе вялікай увагі і дапамогі з боку ўсіх арганізацый і шырокіх колаў грамадзкасьці. Калгасныя газэты робяць выключна адказную і палітычна важную справу. Яны фармуюць новае жыцьцё ў пізох на вёсцы.

Р. ДОДЗІН.

*) Канец. Пачатак глядзі ў № 85.

# За жалезную дысцыпліну працы!

## Ад правільнай арганізацыі вытворчасьці і кіраўніцтва, ад забесьпячэньня цьвёрдага парадку ўнутраной дысцыпліны на вытворчасьці залежыць пасьпяховае разьвіцьцё прамысловасьці і выкананьне прамфінпляну.

## Фабзаўкомы слаба ўявілі сабе дырэктыву ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальні

## ЗАУКОМ АБАРАНЯЕ... РВАЦТВА

**Неабходна ўстанавіць такі парадак кіраўніцтва вытворчасьцю, які гарантаваў-бы падпарадкаванасьць і адказнасьць кожнай занятай на вытворчасьці асобы—ад дырэктара да радавога рабочага—за даручаную яму справу, і які выключаў-бы безадказнасьць, блытаніну і фактычнае безначальле на вытворчасьці, якое выцякае з умяшальнасьці аднаго органу ў функцыі другога.**
**(З пастановы ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальні).**

Завод «Камунар» мае вялікія посьпехі ў выкананьні прамфінпляну. Але на заводзе ёсьць яшчэ рад недахопаў, пры зьніштэньні якіх можна было-б дасягнуць значна большых вытворчых посьпехаў.

Возьмем хаця-б выкананьне дырэктывы партыі аб адзінаначальні. Гэтай дырэктывы нават не ўявіў сабе і сам заўком.

Калі заўкому трэба было паслаць на вёску людзей, а ў гэты самы час ня было на заводзе дырэктара, дык старшыня заўкому сам зьняў рабочых з працы і паслаў на вёску. Такі-ж самы выпадак быў з пасылкай рабочага па ашчаднай справе. Дырэктар заводу толькі праз два дні даведаўся, што рабочы пасланы заўкомам на іншую працу.

Нават Савет фізкультуры (!?) без дазволу дырэктара заводу паслаў двух чалавек у вёску, на гледзячы на тое, што адзін з гэтых рабочых высока кваліфікаваны і яго ня было кім замяніць.

А вось яшчэ больш абураючы выпадак. Рабочы заводу Пітковіч, які выробляў шківы для камнядробілак, рабіў вельмі многа браку—**да 50 проц.**, за тое зарабляў звыш 300 руб. у месяц. Ня гледзячы на шматлікія паказаньні майстра т. Копача, Пітковіч рабіў пасвойму і на ўсе загады адказваў:

— Напляваць мне на ўсё, хоць сёньня зьнімеце з работы, я свае 300 руб. заўсёды зароблю.

Адміністрацыя прымушана была зьняць Пітковіча з работы. Заўком-жа наглядзеў на гэта інакш. Ён стварыў канфлікт і перадаў справу на разгляд працэсіі, якая аднавіла Пітковіча на працы з выплатай за прагул. Зразумела, што рабочыя гэтым абураны, а рвачы радуюцца, кажучы:

— Рві, братка, працэсія адновіць...

І на заводзе «Камунар» некаторыя майстры ня хочуць несьці адказнасьці за работу цэху. Таму ў габінэце дырэктара амаль штодзенна чутны скандалы з рабочымі.

Адносна працы вытворчай камісіі і парады дырэктар т. Левін гаворыць, што апошнія працуюць ня кепска, уносяць дзелавыя прапановы, што ні адно пытаньне гаспадарчага характару не праходзіла міма вытворчай камісіі і парады.

— А як выконваюцца прапановы рабочых?

— Па магчымасьці—адказвае т. Левін.

— На...25 проц.—дадае сакратар т. Палей.

Адносна давядзеньня прамфінпляну да кожнага рабочага т. Левін мае сваю думку:

— Прамфінплян да кожнага рабочага —кажа ён,—можна давесьці толькі тэарытычна, а практычна немагчыма (?!)

Трэба спадзявацца, што камунараўцы зьніччаць і гэтыя недахопы, каб быць на ўсіх адносінах першымі.

Рабочы.

## ФАБКОМ СЬЦЕРАЖЭ СВОЙ АУТАРЫТЭТ

**«Усе яго (дырэктара. — Рэд.) апэрацыйна-гаспадарчыя распараджэньні як для ніжэйшай адміністрацыі, так і для рабочых, бязумоўна абавязковы, якую-б пасаду яны не займалі ў партыйных, прафэсыянальных і іншых арганізацыях».**
**(З пастановы ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальні).**

— Парушэньняў дырэктывы партыі аб адзінаначальні, можна сказаць, у нас і ня было, — так заяўляе дырэктар мясцкай абутковай фабрыкі тав. Шэрман. — Мне здаецца, што мае загады выконваюць... Можа ў цэху здараюцца часамі выпадкі, калі рабочыя ня выконваюць загадаў майстроў...

Але тав. Шэрман забыў сказаць, што майстры да гэтага часу ня хочуць браць на сябе адказнасьці за пераход таго ці іншага рабочага на іншую работу. У такіх выпадках яны зэўсёды шукаюць тэхнічнага кіраўніка Мацыеўскага, каб узгадніць з ім гэта пытаньне.

З боку паасобных адсталых рабочых наглядаюцца выпадкі грубага парушэньня прынцыпу адзінаначальля. Просіць, напрыклад, майстар Макарэвіч сьлесара Лагуна скончыць рамонт машыны, каб унікнуць прастою. Лагун распараджэньня ня выканаў. У выніку машына стаяла поўгадзіны. Ёсьць яшчэ адзін такі рабочы — Карасік, які ніколі ня выконвае загадаў майстроў і пядбайна адносіцца да варштатаў.

Майстры скардзяцца, што асобныя рабочыя ня хочуць іх слухаць і таму яны прымушаны зварачацца да вышэйшай адміністрацыі за вырашэньнем розных пытаньняў.

— Хто-ж яны, гэтыя рабочыя?

— А навошта гэта я буду гаварыць прозьвішча рабочага, — адказвае майстар. — Не хачу, каб потым на мяне коса наглядалі...

Зразумела, пры такой пастаноўцы пытаньня далёка не заедзеш.

Як-жа на такія зьявішчы рэагуе прафарганізацыя?

— Няпрымна «прыціскаць» рабочых, свае людзі, — кажуць прафработнікі.

Гэта замест таго, каб мабілізаваць грамадзкасьць і адзіным фронтам выступіць на барацьбу за жалезную пралетарскую дысцыпліну на вытворчасьці. Фабком думае, што, калі ён ня будзе змагацца з гультаямі і п'яніцамі, дык ён будзе карыстацца большым аўтарытэтам у рабочых.

Перадавыя рабочыя сьмяюцца з такое пастаноўкі пытаньня. Рабочыя самі ня церпяць гультаёў і п'яніц, якія перашкаджаюць працаваць.

Дырэктыва партыі аб выкананьні працагоў рабочых і вытворчых нарад выконваецца дрэнна. Хаця вытворчая камісія і нарада працуюць ня кепска, але прапановы рабочых і вытворчых нарад выкананы толькі на 40 проц. Чаму гэта? Аказваецца, майстры цэхаў ніяк ня могуць адважыцца самастойна выконваць прапановы рабочых, якія датычаць асобных цэхаў. Майстры чакаюць дазволу вышэйшай адміністрацыі.

Дырэктыва ЦК аб адзінаначальні дрэнна прапрацавана. На фабрыку зараз улілося шмат новых рабочых, якія зусім не ўяўляюць сабе, што такое адзінаначальле. Ня ведаюць аб гэтым і некаторыя старыя рабочыя.

Таксама дрэнна даведзены да рабочых і плянавыя заданьні. Рабочыя ня ведаюць сваіх цэхавых вытворчых плянаў. Адміністрацыя-ж усё абяцае разгарнуць работу на давядзеньні прамфінпляну да варштату.

За ўвесь час правялі адзін сход, прысьвечаны адзінаначальлю, і на гэтым супакоіліся.

А. М.

# На Савецкай Беларусі

### Месячнік „Кніга—калгасам"

**ВОРША.** (Наш кар.). Камсамольскія арганізацыі Аршаншчыны абвясьцілі месячнік прасоўваньня кнігі ў калгасы. У часе месячніка будуць зьбірацца кнігі для калгаскіх бібліятэк і вылучацца лепшыя камсамольцы на работу ў гэтых бібліятэках. Месячнік скончыцца 10-га мая. Усе сабраныя кнігі камплектуюцца ў бібліятэкі і накіроўваюцца ў калгасы.

### Сплаў пачаўся

**ГОМЕЛЬ.** (Наш кар.). У Гомельскім лясным раёне распачаўся сплаў лесу. На пад'ёмных прыстанях ужо падрыхтавана для сплаву 104.000 куба-мэтраў будаўнічай драўніны. У Верхня-Інуцкім раёне частка лесу, з прычыны маловодзьдзя, засталася на пад'ёмных прыстанях. У Гомельскім раёне для сплаўных работ патрабуецца 3.600 чалавек. Большасьць ужо завербавана. На галоўныя пункты сплаву, як Чачэрск, Ветка, Гомель і Добрупь, райсаюз завёз патрэбныя прадукты і прамтавары.

Горні пастаўлена культурна - бытовое абслугоўваньне плытагонаў. Мясцовыя прафсаюзныя арганізацыі мала ўвагі зварачаюць на гэту работу.

### Не вядзецца культработа сярод калгасьнікаў

**УВАРАВІЧЫ.** (Наш кар.). За паўтары кілёмэтры ад мястэчка Уваравічы знаходзіцца калгас «Дружба» № 1. Гэты калгас арганізаваўся яшчэ 1924 годзе і экзамічна досьць узмацніўся. Але праўленьне калгасу зусім не вядзе культурна - асьветнай работы сярод калгасьнікаў, ня гледзячы на тое, што там ёсьць клюб. Парт'ячэйка таксама слаба цікавіцца культработай сярод калгасьнікаў.

### Будаўнічы сэзон—на Мар'інскім калфондзе

**БАБРУЙСК. (Наш кар.). Сёлета на Мар'інскім балотным калфондзе разгортваецца вялікае будаўніцтва. Мяркуецца асушыць 6.000 гэкт. балота, пабудаваць 230 мастоў, чыгуначную ветку і г. д. Усяго на правядзеньне гэтых работ адпускаецца 1.125.000 руб. Для работ на Мар'інскім калфондзе ў гэтым сэзоне патрабуецца каля 5.000 рабочых. Але акруговая інспэкцыя працы слаба цікавіцца вярбоўкай рабочых, таксама не ўрэгулявана пытаньне з дастаўкай прадуктаў рабочым, якія будуць працаваць на калфондзе. Ня гледзячы на тое, што на Мар'інскім балотным масыве пабывалі прадстаўнікі Белцэнтрасаюзу, Белкаапсаюзу і г. д. і прапанавалі арганізаваць цэлы рад сталовак, ларкоў і каапэрацыйных крам, канкрэтнае работы ў гэтым напрамку не вядзецца. Культурнае абслугоўваньне рабочых таксама пастаўлена дрэнна.**

### Дзе пажарная ахова—у поўным заняпадзе

**АМСЬЦІСЛАЎ.** (Наш кар.). Пажарная ахова ў Амсьціслаўлі (Аршаншчына) пастаўлена дрэнна. Ня гледзячы на прапановы Аршанскай акруговай пажарнай інспэкцыі і АВК аб палепшэньні пажарнае аховы, Амсьціслаўскі РВК не зварачаў на гэта ніякае ўвагі. З прычыны такое нядбайнасьці, нядаўна ў Амсьціслаўлі згарэў хлебазавод, а таксама вялікі пароны млын. Страты ад пажару дасягаюць 100 тыс. руб. Пажарная каманда бязьдзейнічае. У самы разгар палявых работ калгасы павінны былі забіраць з работы коняй і адсылаць іх у раён, для таго, каб прывозіць насеньне, машыны, фураж і г. д. Да пачатку палявых работ гэтая справа ня была наладжана райкалгасаюзам.

Як паказалі першыя дні палявых работ і пачатак сяўбы, толькі самая нязначная частка калгасаў здавальняюча падрыхтавана да сяўбы. У пераважнай жа частцы калгасаў палявыя работы суправаджаюцца перабоямі.

Трэба адзначыць, што пачатак палявых работ выклікаў энтузіязм калгасьнікаў. Яны вышлі на працу сваячасова і адносяцца да сваіх абавязкаў уважліва і гаспадарча. У калгасе імя Дзяржынскага ў першы-ж дзень палявых работ былі завораны ўсе поласы, якія ня былі ўзьняты пад зяблева і забаранавана 20 гэкт., вывезена 400 вазоў гною.

Выявіліся, між іншым, наступныя адмоўныя бакі. Калгас у вёсцы Ручаўка слаба забясьпечаны збруяй: на 120 коняй — толькі 80 спраўных хамутоў, не хапіла лейцаў, падсядзельнікаў і інш., акрамя таго, неадрамантаваны сявярка, 7 плугоў і 4 бараны.

Ва Ўборкаўскім калгасе інвэнтар і іншыя сродкі вытворчасьці ў парадку, аднак не хапіла такіх дробязяй, як 10 супоняў, 7 падсядзельнікаў і лейцаў. Гэта, праўда, дробязі, але яны перашкаджалі скарыстаць людзкую сілу і рабочую жывёлу на ўсе 100 проц.

Такі малюнак пачатку сяўбы ў некаторых лепшых калгасах. У большасьці калгасаў работа яшчэ не арганізавана, форма апшаты ня вызначана.

Што-ж датычыць падрыхтаванасьці да сяўбы індывідуальнага сэктару, дык яна не гарантуе выкананьня ім пляну веснавой кампаніі.

Становішча тым больш сур'ёзнае, што індывідуальны сэктар займае ў раёне больш 85 проц. Яравы клін паказаны індывідуальным гаспадаркам толькі ў 8 сельсаветах; усяго-ж у раёне 14 сельсаветаў. Раённыя арганізацыі не займаюцца давядзеньнем пляну пашырэньня пасеўнае плошчы і агрыкультурных мерапрыемстваў да асобнага двара. Да 7-га красавіка ніхто не займаўся папулярызацыяй ільгот па новым сельгаспадатку і пастаноў ЦК УсеКП(б). Камітэты сялянскай узаемадапамогі ня склалі насенных фондаў і не клапоцяцца аб дапамозе тым бядняцкім гаспадаркам, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы. Крэдыт індывідуальным гаспадаркам не выдаецца. Вывад:

**Лоеўскі раён да сяўбы падрыхтаваны вельмі дрэнна.** Трэба неадкладна прыняць рашучыя меры, каб праграма бальшавіцкай сяўбы была выканана на ўсе 100 проц. Трэба безадкладна перабудавацца, пераключыцца на сапраўды бальшавіцкія тэмпы, выпраўляючы недахопы на ходу.

Брыгадзір «Зьвязды» П. ПЯЧОНКА.

# З лістоў рабселькораў

### ГАЛАВАЦЯПСТВА І БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ

Пры ст. Вобаль, Вульскага раёну, будуецца тарфяны завод, які будзе даваць подсьціл-торф. На заводзе працуе каля 150 чал. рабочых. Але т. Клямбоцкі, як адміністратар і гаспадарнік, нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. Па яго загадзе быў выкапан катлаван, але апошні аказаўся няпрыгодным і давялося капаць новы. Выкапаныя ямкі ў колькасьці 25 шт. па 2 руб. кожная заплылі вадою. Усё гэта ўляцела дзяржаве ў капеечку.

Клямбоцкі сваё «палажэньне начальніка» скарыстоўвае шырока. За тое, што па нейкіх прычынах згарэла крэсла, якое каштуе 1 р. 50 к., ён звальняе з работы двух беднякоў і аднаго батрака. Аб умовах жыцьця рабочых Клямбоцкі не клапоціцца, няма спэцвопраткі. Калі рабочыя паслалі т. Гапушчанка ў Полацак, каб апошні расказаў інспэктару працы аб цяжкіх умовах, то па прыезьдзе з Полацку яму было адмоўлена ў рабоце. Самакрытыка загнаная. Ня было ніводнага дакладу аб крытыцы і самакрытыцы. Клямбоцкі ня любіць самакрытыкі і, калі хто пачне паказваць на яго памылкі, то зьнімаецца з работы. Сакратар парт'ячэйкі Гінцэр грае ў адну дудку з Клямбоцкім. Наогул трэба падкрэсьліць, што партыйнага вока няма. Больш таго, калі Клямбоцкага працягнулі ў пасьцегазэце, дык ён са злосьці парваў газэту і пачаў цкаваць рэдактара пасьцегазэты.

РСІ гэтым павінна зацікавіцца.

КАВАЛЕРЫСТЫ.

### ВЕДАМАСЬЦЬ У ПАМЫЙНАЙ СКРЫНЦЫ

Работніцы адкормачнага пункту Белмясгандлю ўдзень 8 сакавіка адпрацавалі 2 гадзіны ў карысьць індустрыялізацыі краіны. Але да гэтага часу ня можа спагнаць з Белмясгандлю грошай. Загадчык адкормачнага пункту сваячасова падаў ведамасьць, а супрацоўнікі Белмясгандлю выкінулі яе ў памыйную скрынку.

Хто за гэта павінен адказаць?

А.

### ШКОЛА БЕЗ КІРАЎНІКА

Полацкая прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва, якая павінна рыхтаваць кваліфікаваных рабочых дзесятнікаў, майстроў агнятрывалага будаўніцтва, асабліва патрэбных зараз у раёнах суцэльнай калектывізацыі, — праграму па спэцыяльных дысцыплінах атрымала... толькі гэтымі днямі.

І другое: ня гледзячы на ўгодненасьць з Наркамасьветы аб прысылцы ў школу кіраўніка агнятрывалага будаўніцтвам — Кажэўнікава — апошні і дагэтуль у школу не прыяжджае. І факт застаецца фактам — прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва яшчэ і ня чула, што гэта за «зьвер» дысцыпліна па агнятрывалым будаўніцтве.

А. С

### ЗРЫВАЮЦЦА ЗАНЯТКІ

Больш чым тры месяцы таму назад Гомельскі акругком партыі ўхваліў арганізаваць курсы па падрыхтоўцы рабочых у ВНУ. 40 рабочых мабілізавана на вучобу. Ім за паўтара гады, якія засталіся яшчэ, трэба прайсьці поўны двухгадовы курс падрыхтоўкі ў ВНУ.

Нармальных заняткаў на курсах і дагэтуль няма. Няўжо-ж з-за таго, што няма пакою, акругком партыі сарве прынятую ім пастанову?

Я. Ж.

### КАЛІ БУДУЦЬ СТЫПЭНДЫІ

Урэшце, пасьля доўгіх пераписак, Белсельтрэст закантрактаваў 10 студэнтаў IV курсу віцебскага дзяржаўнага вэтэрынарнага інстытуту. Большасьць закантрактаваных — не стыпэндыяты, а таму маюць надзвычайную матар'яльную патрэбу. Але і дагэтуль кіраўніцтва Белсельтрэсту не прысылае студэнтам стыпэндыі. Гэта ня гледзячы на пастанову Наркамасьветы БССР аб выдачы студэнтам стыпэндый да аб'езду на зімовыя вакацыі, ня гледзячы на тэлеграму праўленьня інстытуту ад 13 студзеня 1930 г. аб хутчэйшай прысылцы стыпэндыі студэнтам, закантрактаваным Белсельтрэстам. Бюракратычным адносінам Белсельтрэсту да падрыхтоўкі кадраў трэба даць належны адпор.

ЗАКАНТРАКТАВАНЫ.

*НЕАДКЛАДНА ПЕРАГЛЯДЗЕЦЬ*

# ЧАМУ АПРАУДАНЫ СПЭКУЛЯНТЫ

## з Гомельскага заводу „Пралетары"

### Судовае сьледзтва замазала факты злачынкай сувязі з прыватнікамі

Бясчынствы, безгаспадарчасьць і зрошчваньне з прыватнікам на заводзе «Пралетары» ў Гомелі—справа нядаўніх дзён.

Працэс адміністрацыі заводу, які скончыўся гэтымі днямі, зноў сканцэнтраваў увагу пралетарскай грамадзкасьці на гэтай справе.

Асноўныя фігуры—груда «былых» людзей і спэкулянтаў, якія прымазаліся да заводу: былы ўласьнік заводу Фрумін, яго кампаньён у мінулым, а цяпер тэхдырэктар гэтага заводу Левін, кампаньёны Фруміна—Ліўшыц і Грынбэрг, загадчык гаспадаркай заводу Любімаў (ён і Левін пляменьнікі Фруміна) і іншыя.

Гэта «цёплая» кампанія глядзела на завод, як на свой уласны, і шырока выкарыстоўвала ўсе спосабы і магчымасьці рвацтва.

Фішбэйн і Баршчукоў—кіраўнікі заводу, пастаўленыя на гэты пост партыяй і савецкай уладай,—знаходзіліся цалкам над уплывам «спэца» Левіна, яму давяралі і такім чынам сьлепа выконвалі ўсё, што вызначалася раней у «акцыянэрным таварыстве» Левіна, Фруміна і інш.

У канцы 1928 году былі выкрыты злачынствы гэтай кампаніі. Узьнікла крымінальная справа, пераданая ў пачатку 1929 г. гомельскаму акрсуду. Там гэта справа марыцавалася да чэрвеня мінулага году, потым, нарэшце, была назначана да слуханьня і зноў чамусьці адкладзена. Зусім нечакана Левін і Фрумін былі акрсудом з-пад варты вызвалены. Кампанія рвачоў мела магчымасьць згаварыцца паміж сабою і апрацаваць агульны плян дзейства.

Такія дзіўныя паводзіны гомельскага акрсуду (прыпыненьне слуханьня у чэрвені 1929 г. і далейшае марыцаваньне яе ў працягу паўгода)—зьвярнулі на сябе ўвагу камісіі ЦКК КП(б)В, якая запрапанавала справу перадаць у Вярхоўны суд БССР.

Праз год пасьля сканчэньня папярэдняга сьледзтва выязная сэсія Верхсуду ў Гомелі разгледзела гэту справу.

На чацьверты дзень разгляду ў адносінах асноўнай групы падсудных, быў вынесены апраўдальны прыгавар. Фармулёўка: «адсутнасьць складу злачынства».

Апраўдальны прыгавар былому ўласьніку заводу Фруміну, спэкулянтам Грынбэргу і Ліўшыцу, іх пайпечнікам з работнікаў заводу—Левіну, Любімаву і некаторым іншым,—выклікаў справядлівае зьдзіўленьне пралетарскай грамадзкасьці.

Характарыстыка падсудных досыць добра была выяўлена на судзе, і добра запомнілася. Няма патрэбы яе паўтараць. Некалькі толькі заўваг па сутнасьці справы:

На складах не хапае меднай арматуры на 3.222 р., спэцвопраткі—на 858 р. 28 к., сьвядома павялічаецца вага купленых заводам у кампаньёна Фруміна нейкага Грынбэрга частка фрэкцыйнага прэсу і паравога молату на 57 пуд. 17 ф., у выніку чаго Грынбэрг і Фрумін незаконна атрымліваюць з заводу лішніх 60 п. чыгуннага ліцьця. Не хапае к канцу апэрацыйнага году 36.484 кілё чыгуннага ліцьця і 65 тон коксу—усё гэта робіцца Любімавым—загадчыкам гаспадаркі заводу, пляменьнікам былога ўласьніка заводу Фруміна, усё гэта ўстанаўляецца данымі папярэдняга і судовага сьледзтва і ўсё гэта прызнана «закономерным» — Любімава апраўдаваць.

Дзе клясавы падыход? Дзе абарона інтарэсаў савецкага прадпрыемства?

Дзяржаўны абвінавачэньне не знайшоў нават ускосных довадаў зрошчваньня тэхдырэктара Левіна з прыватнікам, калі сьледчы матар'ял даводзіў простую сувязь. Прыходзіцца толькі разводзіць рукамі і пытацца, як трэба разумець сувязь з прыватнікам. З якога часу заключэньне яўна невыгодных для дзяржаўнага заводу зьдзелак начало прызнаваецца нармальным і закономерным зьявішчам.

**Ці ня трэба над гэтым прызадумацца пленуму Верхсуду?**

Кампанія Фрумін—Левін купляе ў гор. Рослаўлі фрэкцыйны прэс і паравы молат, з мэтаю зарабіць на гэтым; куды ж як не на «свой» завод выгадней за ўсё гэта збыць—і вось Левін зьяўляецца ў сваёй другой ролі тэхдырэктара заводу, купляе фрэкцыйны прэс і паравы молат, наперад ведаючы аб слабой прыгоднасьці гэтых машын.

Прыбытак падзяляецца на тры роўныя часткі — Фрумін, Левін і Грынбэрг.

Значыць, Левін зрабіў яўна нявыгодную для дзяржавы куплю, зьяўляючыся ўласьнікам гэтых машын. У таго-ж Фруміна завод, у асобе Левіна, купляе нявыгодныя варштаты для выпрацоўкі шурупаў, маятнікаў ціл, радыятараў і інш., прычым Фрумін на гэтым зарабляе 900 проц.

Выхад Левіна з заводу ў 1926 г. быў выкліканы не хваробаю, а адыходам на заработкі. Так, Левін разам з Фрумінам у часе перапынку ў рабоце на заводзе купіў лёкамабіль, потым прадаў яго Смаллесу за 11.500 руб.

**І тут суд не знайшоў сувязі з прыватнікам.**

Віна іх у тым, што яны склалі фіктыўны дадатковы вопіс на інструманты і абсталяваньне, чым былі ўтоены страты арматурнага цэху на 32.276 руб., судовым сьледзтвам абвергнута ня была. Усяго гэтага мала для выязной сэсіі Верхсуду—«ва ўсім гэтым няма складу злачынства».

Чым кіравалася выязная сэсія, паверыўшы сьведкам абароны ў тым, што заказ на паравозы быў прыняты з мэтаю затрымаць на заводзе кваліфікаваную рабсілу. Калі гэта так, дык чаму-ж паравозы пачалі рабіцца толькі праз год пасьля прыёму гэтага заказу? Дзе лёгіка? **Яўная-ж нявыгоднасьць гэтага заказу і нямэтазгоднасьць досыць устаноўлены.**

Судовым сьледзтвам абвінавачаньне не даведзена—так фармуляваў прыгавар суд, а між тым, **асноўныя сьведкі абвінавачаньня: Сярдзюк, Фрэйман, Калісьнічанка і іншыя—

# Першы ў Менску дом-камуна

Камандны склад Менскага гарнізону ўжо даўно думаў над пытаньнем перабудовы свайго быту. Трэба было вырашыць, якім чынам пазбавіць сваю сям'ю ад чаднай кухні і абывательскіх плётак, якім чынам даць магчымасьць сваім жонкам прымаць удзел у грамадзкай рабоце, як паставіць правільнае выхаваньне дзяцей, пазбавіўшы іх ад бяспрытульнага становішча.

У сувязі з радам труднасьцяй, з якімі спачатку сустрэліся ініцыятары гэтай справы (непрыстасаванасьць памяшканьня, недахват сродкаў і г. д.), арганізацыя дому камуны тармазілася. Урэшце, група актывістых партыйцаў цьвёрда парашыла, ня лічачыся ні з якімі труднасьцямі, **ва што-б'там ні стала інтэрнат ваенведу ператварыць у бытавую камуну.**

Неадкладна быў склікан агульны сход жыхароў інтэрнату (**43 сям'і**) і пастанавілі: **«Да гадавіны РСЧА бытавую камуну каманднага складу адкрыць».** Тут-жа выбралі арганізацыйную пяцёрку, якой даручылі распрацаваць пытаньне адносна паёў, абсталяваньня кухні-сталоўкі, дзіцячага пакою і апрацаваць статут.

Пры дапамозе палітычнага аддзелу кавдывізіі і паліткіраўніцтва БВА 18-га лютага **бытавая камуна, названая імем 12-й гадавіны РСЧА была адкрыта.** Бытавая камуна пабудавана на прынцыпе самаабслугоўваньня, г. зн. што наёмную сілу складае толькі повар і дзьве кіраўніцы дзіцячага саду, уся іншая праца праводзіцца дзяжурнымі камунарамі. Напрыклад, дзьве жанчыны дзяжураць на кухні, адна ў дзіцячым пакоі і два мужчыны, у абавязак якіх уваходзіць забясьпечыць кухню апалам. Для куплі прадуктаў выбрака гаспадарча-бытавая камісія, якая вылучае ад сябе на чарзе на два тыдні дзьвёх жанчын, у якасьці гаспадынь. Агульнае-ж кіраўніцтва камуны належыць выбранаму савету. Культурная камісія кіруе правядзеньнем заняткаў розных гурткоў і лекцый. Уся камуна пры дапамозе **дому** аказвае значную дапамогу шматсямейным і тым, што атрымліваюць маленькую пэнсію. Заработак камунара падаляецца па колькасьці членаў сям'і, пай спаганяецца з сумы, што прыпадае на долю кожнага. Напрыклад, з заработку ў 100 руб. і больш пай з аднаго члена сям'і спаганяецца ў 37 руб. Тыя, што атрымліваюць 30 руб., уносяць пай 19 рублёў. Прычым члены сям'і, якія не зарабляюць, уносяць адну трэцюю з сумы ўнесенага паю. За дзяцей плацяць ад 6 да 11 руб. 30 кап. (гэта залежыць ад колькасьці дзяцей і ад іх узросту).

Галоўным тормазам у арганізацыі бытавое камуны зьявілася **непрыстасаванасьць нашых інтэрнатаў, з іх маленькімі пакоямі і асабовымі кухнямі.** Будаўнічым органам гэта трэба ўлічыць і зьвярнуць сваю ўвагу на пабудову такіх дамоў, якія-б адпавядалі запатрабаваньням калектывізацыі працоўнага быту.

З моманту арганізацыі нашае камуны ў інтэрнаце па Савецкай, 61 усё пайшло пановаму. Змоўк шум «прымусаў» на кухні, а разам з ім зьніклі склока, плёткі, лаянкі. Інтэрнат пачаў жыць пановаму, пакалектыўнаму. І калі раней у сяго-таго былі сумненьні, што з гэтай справы нічога ня выйдзе, то мы адзначаем, што па нашым вопыце ўжо арганізавана такая-ж камуна ў другім інтэрнаце і намячаецца ў трэцім.

**А. ГРЫШАНАЎ.**

У СТАЛОЎЦЫ

# Арганізацыя с.-г. аддзелу ўсебеларускай выстаўкі пад пагрозай

Знадворку машына ідзе поўным ходам: стукаюць, пілуюць, сякуць і ў хатычным награмаджэньні сам чорт ногу зламае.

Але ў сельска-гаспадарчым аддзеле настрой пэсымістычны.

— Дзьве дакладныя запіскі падаў і... як ад сьценкі гарох,—нахмурна гаворыць адзін з агранома.

— Падавай трэцюю,—злосна кідае яго таварыш, які складае параўнальную табліцу ўсхожасьці насеньня.

Недабудаваны павільён шчыльна набіты экспанатамі з Аршаншчыны і Магілеўшчыны. Некалькі акруг не разабраны—ляжаць: няма куды дзець.

Аграномы сядзяць на скрынях, на мяшках з насеўным матар'ялам, пішуць, лічаць зярняткі, узважваюць, вымяраюць...

— А гэта не пашкодзіць?—пытаюся я, паказваючы на прымятыя экспанаты, складзеныя кучамі.

— Э-э... гэта драбніца, выправім. Вось дзе шкода непапраўная...—Аграном паказвае праз адчыненыя дзьверы на недабудаваны **вэгетацыйны павільён.**

— Гэты павільён павінен быць абавязкова гатовым да 1-га мая, бо да 15-га мы павінны разьмясьціць і засеяць там усе слоікі з расьлінамі, якія адначасова высейваюцца на поле. Пры цяперашніх тэмпах вэгетацыйны павільён гатоў ня будзе—гэта факт... І гэта, галоўнейшая паказальная частка ўсяго с.-г. аддзелу будзе сарвана... Што загадаеце рабіць?

— Хто-ж вінаваты?

— Э-э... шукай вінаватага...—бурчыць пішучы табліцу.—Цяпер трэба справу рабіць... пішы яшчэ дакладную...

— Пад пагрозай зрыву знаходзіцца і ўся садова-дэкарацыйная частка,—злуючыся гавораць разам абодва аграномы. Марудзяць з будоўляй... напэўна думаюць, што другое лета пасьля жнівіня будзе... Не пасьпеюць ні клюмбы, ні газоны... нічога.

Аграном садзіцца пісаць трэцюю дакладную запіску «аб пагрозе зрыву вагетацыйнага аддзелу і садова-дэкарацыйнага»...

Ці чуеце, таварышы з выставачнага камітэту?

**А. О.**


ЧАРГОВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПРАЦАЎНІКОЎ ІНСТЫТУТУ АХОВЫ ПРАЦЫ
АДБУДЗЕЦЦА
НА ЗАВОДЗЕ „БАЛЬШАВІК" СУМЕСНА З РАБОЧЫМІ ЗАВОДУ
— 14-IV г. г. а 3 з паловаю гадзіне дня —
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Вынікі дасьледваньня Інстытутам заводу „Бальшавік".
Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя.
Дырэктар Інстытуту Аховы Працы пры НКП БССР ДЗІХЦЯР.



*Да ведама падпісчыкаў „Зьвязды"*
З сёньняшнім нумарам газэты „Зьвязда" рассылаецца дармовы дадатак— ГАЗЭТА „ПРАФРУХ" № 7
Падпісчыкі! Пры атрыманьні «Зьвязды» патрабуйце дадатак „ПРАФРУХ"


ЗЬВЯЗДА.

# МЕНСК

## 10 мільёнаў рублёў на пабудову мэханізаванай гуты

**Будаўнічы камітэт ВСНГ СССР канчаткова зацьвердзіў праект пабудовы першай на Беларусі мэханізаванай гуты. На месца работы, каля Гомелю, прыехаў з Масквы інжынэрна - тэхнічны пэрсанал у складзе 3-х інжынэраў, 3-х тэхнікаў, 4-х дзесятнікаў і 50 кваліфікаваных рабочых. Сёлета на будаўніцтве будзе занята 700 рабочых.**

**На гэты год на работы адпушчана каля 2-х мільёнаў руб. 1-га мая на тэрыторыі будаўніцтва адкрываецца сталоўка, амбуляторны пункт і г. д. Устанаўляюцца аўтобусныя зносіны паміж Гомелем і месцам будаўніцтва. Агульны кошт работ першай чаргі — 10 мільёнаў рублёў. Завод павінен быць пушчаны ў сьнежні 1931 г.**

## Новая электрастанцыя—у Полацку

Беларускае аддзяленьне электратэхнічнага трэсту заключыла дагавор на пабудову ў Полацку новае гарадзкое электрастанцыі магутнасьцю ў 10 тысяч кілёват. Станцыя, акрамя Полацку, будзе абслугоўваць калгасы на тэрыторыі ў 30-35 кілёмэтраў. Агульны кошт станцыі — 5 мільёнаў рублёў. Станцыя павінна быць пушчана ў 1932 годзе.

## Брыгада спэцыялістых выяжджае ў Рагачэўска-Жлобінскі камбінат

**Гэтымі днямі выяжджае з Менску ў Рагачэўска-Жлобінскі агракамбінат брыгада НКАЗ у складзе трох працаўнікоў ад клінікі прафзахворваньняў, па адным прадстаўніку ад інстытутаў мікрабіялёгіі, санітарна-гігіенічнага, сухотнага, аданталёгічнага і фізыятрычнага.**

**Брыгада дапаможа мясцовым арганізацыям скласьці пляны будаўніцтва лазьняў, арганізацыі мэдычных пунктаў і г. д.**

## Навіны МЦРК

МЦРК распрацаваў правілы **абслугоўваньня сэзоньнікаў.** Паводле гэтых правіл, рабочыя сэзоньнікі, якія прыбываюць па выклику будаўнічых і гаспадарчых арганізацый, забясьпечваюцца наборнымі лісткамі непасрэдна праз адміністрацыю будаўніцтва на месцы сваёй працы. Усе іншыя сэзоньнікі атрымліваюць наборныя лісткі ў МЦРК.

***

Згодна пастановы адпаведных органаў, **пайшчыкам, якія згубяць свае хлеба-мясныя лісткі,** новыя з МЦРК выдавацца ня будуць.

## Агляд працы школ сацвыху

НК РСІ сумесна з саюзам працаўсьветы прыступіў да агляду пэдагагічнае работы ў школах сацвыху. Для агляду пасобных школ створаны брыгады, у якія ўваходзяць і рабочыя прадпрыемстваў. Агляду падлягаюць школы сацвыху Менскай, Гомельскай і Полацкай акруг.

## За дзень

— У пачатку мая ЦІ саюзу гарбароў склікае **ўсебеларускую канфэрэнцыю інжынэрна - тэхнічных працаўнікоў гарбарнай прамысловасьці.** На канфэрэнцыі будуць стаяць пытаньні аб рэканструкцыйным пэрыядзе і ўдзеле ў ім інжынэрна - тэхнічных працаўнікоў.

— У канцы красавіка адбудзецца **ўсебеларуская канфэрэнцыя рабочых шчотачных і шчацінных прадпрыемстваў** па пытаньнях выканаьня прамфінпляну за першае паўгодзьдзе 30 году.

## СУД

### Шпіёна да расстрэлу

У сакавіку 1928 году селянін **М. Каратквеіч** затрымаў на хутары Барылы, Качынскага сельсавету, Полацкай акругі, невядомага грамадзяніна, які меў пры сябе польскія дакументы.

Сьледзтвам было ўстаноўлена, што невядомы зьяўляецца жыхаром вёскі Мацыркі, Дзісенскага павету, Віленскай губэрні, што знаходзіцца за 1½ клм. ад польска-савецкай мяжы, **Лаўрыновічам** Піліпам.

У 1925 годзе Лаўрыновіч, па заданьні польскай дэфэнзывы, перайшоў мяжу на савецкі бок з мэтай шпіянажу, за што ў тым-жа 1925 годзе быў прыгавораны рэўтрыбуналам да 7 год зьняволеньня і знаходзіўся ў менскім папраўчым доме. У 1927 годзе па амністыі, у адзнаку дзесяцігодзьдзя існаваньня Савецкага Саюзу, Лаўрыновіч быў вызвалены з-пад варты.

У студзені 1928 году афіцыйным парадкам выехаў у Польшчу, дзе зноў паступіў на службу ў польскую разьведку, а праз два месяцы перайшоў польска-савецкую мяжу, каб зьбіраць весткі пра прымежныя часьці Чырвонай армії.

6-га красавіка Полацкі акруговы суд прыгаварыў Лаўрыновіча па 68 арт. КК да расстрэлу.

11-га красавіка Вярхоўны суд гэты прыгавар зацьвердзіў.

Б—ь.

## Рабочых і калгасьнікаў на курорты

**Нарыкамат Аховы Здароўя БССР разьмеркаваў па акругах 52 месцы для пасылкі калгасьнікаў на курорты СССР. Менскай акрузе прызначана 9 месц, Магілеўскай—11 і г. д.**

**Апрача таго, 158 месц перададзены галоўсэцстраху для пасылкі на курорты застрахованых, з якіх 127 месц для рабочых і 31 месца для служачых. Месцы павінны быць выкарыстаны ў пэрыяд май—чэрвень.**

### РЭКАНСТРУКЦЫЯ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК»

Спэцыяльна вылучаная камісія з прадстаўнікоў ВСНГ, саюзу гарбароў і інш. зацікаўленых арганізацый склала праект перабудовы гарбарні «Бальшавік». Паводле гэтага праекту, усе хромавыя вырабы будуць сканцэнтраваны на гарбарні «Бальшавік» і стандартызаваны. Будзе таксама пераабсталёван і дубільны тэх і пашыраны рад іншых цэхаў. У сувязі з рэкаструкцыяй гарбарні «Бальшавік» зьменшыцца кошт прадукцыі і значна паленшыцца яе якасьць.

### НЕ ПСАВАЦЬ СЬВІНОЕ СКУРЫ

ВСНГБ, сумесна з Усебеларускім аб'яднаньнем гарбарнай прамысловасьці і ЦП саюзу гарбароў, узьняў перад адпаведнымі органамі пытаньне аб забароне каапэрацыйным арганізацыям, прадпрыемствам, а таксама прыватным асобам пры забоі смаліць і абварваць сьвіней, бо пры гэтым псуецца вельмі каштоўная скура. Сёлета мае быць загатоўлена паўтара мільёна сьвіных скур.

## *Тэатр і музыка*

### Да гастроляў каўкаскага этнаграфічнага ансамблю

Сёньня ў Белдзяржтэатры адбудзецца гастроль каўкаскага этнаграфічнага мастацкага ансамблю—так званых «Горных арлоў Каўказу».

У праграме—розныя віды мастацтва Каўказу—скокі, музыка, сьпевы і часткова спорт. Ансамбль рыканае рад цікавых скокаў каўкаскіх народаў—грузінскія, чачэнскія, асецінскія, скокі з кінжалам, скокі джыгітаў і г. д., народныя сьпевы пад сваяўіты акампанімэнт зурны і барабану.

Асабліва цікавы квартэт з народных каўкаскіх інструмантаў. У ансамблі—12 чал.

# Як будзе праведзена сьвяткаваньне 1-га мая

## ПА МЕНСКАЙ АКРУЗЕ

Сьвяткаваньне павінна праходзіць, як палітычная кампанія, пад лёзунгамі:

1-га мая — дзень інтэрнацыянальнай пралетарскай салідарнасьці. 1-га мая—дзень агляду рэвалюцыйных сіл міжнароднага пралетарыяту. Буржуазія разам з сацыял-фашыстымі рыхтуе імпэрыялістычную вайну супроць СССР, рабочая кляса пад кіраўніцтвам Камінтэрну аберне яе ў грамадзянскую вайну за дыктатуру пралетарыяту. На «крыжовы паход» адкажам узмацненьнем абароназдольнасьці нашае краіны. Праз сацыялістычнае спаборніцтва фабрык і заводаў, саўгасаў і калгасаў узмоцнім тэмп індустрыялізацыі нашае краіны, перавыканаем прамфінплян. Узьнімем усю рабочую клясу на барацьбу з прагуламі, бракам, п'янствам, за максымальнае ўзьняцьце працдысцыпліны. Кожны новы посьпех СССР зьяўляецца ўдарам па міжнароднай буржуазіі. Калектывізацыя—адзіна правільны шлях да паляпшэньня становішча батрацтва, беднаты, сераднякоў. Калектывізацыя зьяўляецца магутным сродкам узьняцьця таварнасьці сельскае гаспадаркі. За гаспадарчае замацаваньне калектывазы, узьняцьцё ўраджайнасьці, пашырэньне засеўнай плошчы! За рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі! Узмоцнім барацьбу з праваапартуністычнымі ўхіламі і левымі загібамі! За рашучае выпраўленьне палітычных памылак у калгасным будаўніцтве!

Узмоцнім вытворчую змычку рабочае клясы з працоўным сялянствам! Мабілізуем пралетарскую грамадзкасьць на барацьбу з рэлігійным дурманам! За разьвіцьцё культурнай рэвалюцыі, за інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных, супроць антысэмітызму і шавінізму, за клясавую сьвядомасьць працоўных мас!

Практычныя задачы пры правядзеньні першага мая наступныя:

1) Скарыстаць падрыхтоўку самога сьвята ў мэтах растлумачэньня і мабілізацыі шырокіх рабочых, батрацка-бядняцкіх, сераднякоў і чырвонаармейскіх мас вакол асноўных задач партыі і савецкай улады.

2) Падрыхтоўчую работу пачаць з 15 красавіка, вылучыўшы першамайскія камісіі па прадпрыемствах, установах і клюбах. Камісіі на падставе агульнага пляну складаюць свае канкрэтныя пляны, дастасоўваючы іх да мясцовых умоў.

3) Прыцягнуць усіх членаў прафсаюзаў, чырвонаармейцаў на дэманстрацыю 1-га мая ў горадзе і раёнах з удзелам шырокіх мас калгасьнікаў і працоўнага сялянства.

4) Падрыхтоўка і правядзеньне сьвята 1-га мая павінна праходзіць пры актыўным удзеле прафэсыянальнага, савецкага, партыйна-грамадзкага актыву.

5) Пачынаючы з 20-га красавіка, па ўсіх прадпрыемствах, клюбах, нардамох, хатах-чытальнях, чырвоных кутках, саўгасах, калгасах і дэлегацкіх сходах праводзяцца гутаркі аб значэньні першамайскага сьвята. Гутаркі ўвязваць з асноўнымі лёзунгамі сьвяткаваньня.

6) Усім клюбным гуртком (драматычным, музычным, харавым і інш.), бібліятэкам і перасоўкам на прадпрыемствах зараз-жа пачаць падрыхтоўчую работу да правядзеньня першамайскіх сьвят, а таксама прыстасаваць спэцыяльны выпуск першамайскіх шматтыражных газэт.

7) Падрыхтаваць фізкультурныя гурткі, аркестры, хор, струнныя і музычныя гурткі для арганізаванага ўдзелу ў дэманстрацыі, у выступленьні на вечарох і гульнях у дзень сьвяткаваньня. Падабраць адпаведны да сьвята, ідэалёгічна вытрыманы і мастацка-каштоўны рэпэртуар.

8) 1, 2, 3 мая шэфам арганізаваць выезды ў падшэфныя раёны.

### СЬВЯТКАВАНЬНЕ Ў ГОРАДЗЕ

1) 30 красавіка, 1 і 2 мая па ўсіх культурных установах арганізаваць мастацкія вечары з удзелам падшэфных чырвонаармейскіх часьцей і прадстаўнікоў падшэфных калгасаў.

2) 30 красавіка правесьці ўрачыстае пасяджэньне гарсавету.

3) 1-га мая ўсе рабочыя і служачыя (згодна маршруту, які будзе апублікаваны) бяруць удзел у першамайскай дэманстрацыі. Чырвонаармейскія часьці прымаюць удзел у дэманстрацыі, паводле загаду камандаваньня. Фізкультурнікі дэманструюць асобнай калёнай. Дэманстрацыя павінна быць памастацку абсталявана (карнавалы, лёзунгі, плякаты і інш.).

4) 2-га мая арганізуецца спэцыяльнае сьвята фізкультурнікаў, прысьвечанае першамайскім урачыстасьцям і адкрыцьцю летняга спартыўнага сэзону. Па выбары мясцовых арганізацый у гэты дзень паладжваюцца экскурсіі, гулянкі за горад.

5) 1-га мая з 5-ці гадзін увечары ва ўсіх кіно адбываюцца дармовыя сэансы, БДТ-2 дае дармовую пастаноўку для членаў саюзу і Чырвонай армії. Белдзяржкіно арганізуе кіно-сэансы на адкрытым паветры.

6) 2-га мая арганізаваць піянэрскую дэманстрацыю разам са школьнікамі (для акцябрат скарыстаць аўтатранспарт). Па школах і клюбах арганізаваць мастацкія вечары і дзіцячыя ранішнікі.

7) Упрыгожыць сьцягамі, зеляніной і лёзунгамі ўсе ўстановы, клюбы, нарды, хаты-чытальні, чырвоныя куткі і дамы г. Менску.

### НА ВЁСЦЫ

1. Сьвяткаваньне 1-га мая на вёсцы праводзіцца пад тымі-ж лёзунгамі, што і ў горадзе, прычым цэнтрам увагі павінна быць веснавая засеўная кампанія, падняцьце ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі, пашырэньне засеўнае плошчы, гаспадарчае замацаваньне калгасаў, азнаямленьне з новым статутам с.-г. арцелі, ільготамі па с.-г. падатку.

2. Падрыхтоўчую работу на вёсцы пачаць з 12 красавіка, арганізаваць раённыя і сельскія камісіі, якія апрацоўваюць пляны, выходзячы з мясцовых умоў.

3. 30 красавіка правесьці ўрачыстае пасяджэньне сельсаветаў з удзелам шырокіх колаў працоўнага сялянства.

4. 1-га мая арганізаваць дэманстрацыі рабочых і служачых з максымальным удзелам калгасьнікаў, батрацтва, беднаты і сераднятва.

5. 30 красавіка, 1, 2, 3 мая арганізаваць па ўсіх пардамох, хатах-чытальнях, чырвоных кутках урачыстыя мастацкія вечары. Асабліва сьвяткаваньне 1-га мая павінна быць праведзена па саўгасах і калгасах з удзелам батрацтва, беднаты і сераднякоў вакольных вёсак.

6. Рабочыя з шэфскіх арганізацый прымаюць актыўны ўдзел у сьвяткаваньні ў сваіх падшэфных раёнах, дзеля гэтага трэба арганізаваць масавыя выезды з аркестрамі, драматычнымі гурткамі, кіно-перасоўкамі і інш.

7. Прыстасаваць для сьвяткаваньня 1-га мая адкрыцьцё бытавых устаноў—ясьляй, пляцовак, сталовак і інш.

8. Арганізаваць урачысты выпуск лікпунктаў.

9. Па саўгасах і калгасах арганізаваць ударныя брыгады імя 1-га мая.

10. Арганізаваць у Койданаўскім раёне ўрачыстае адкрыцьцё машына-трактарнай станцыі.

**ПЕРШАМАЙСКАЯ КАМІСІЯ.**

# ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

### АД ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б

**Дакладчыкамі ў парт'яч. Фрунз. раёну для прапрацоўкі вынікаў сакавіковага пленуму ЦК КП(б)Б выпучаюцца наступныя т. т.:**

**Ад АПА ЦК: ГУРЗВІЧ да рымарскае фабрыкі, СЯНЬКЕВІЧ—завод «Дрэваапрацоўшчык» і БУДЗІНСКІ—друкарня БДВ; ад ВСНГБ: ГРЫСЕВІЧ—Эльвод і ВАСКАБОЙНІКАЎ—завод «Камунар»; ад рэдакцыі газэты «Зьвязда»: МІТЛІН—аўтакіраўніцтва і АСЬМОЎ—парткалектыў рэдакцыі газэт; ад рэдакцыі «Рабочай»: ЯКАЎЛЕЎ—ф-ка «Камунарка» і РОЗЭНБЛЮМ—яч. аддз. хлебазаводу; ад газэты «Бел. Вёска»: ШУКЕВІЧ-ТРАЦЬЦЯКОЎ—каап. прадпр. харчавікоў і ШМІДТ—завод «Беларусь»; ад Камвузу БЕЛАШЭЎСКІ—яч. сталовак МЦРК, САЕВІЧ—хлебазавод, ЯРМОЛІН—галянтарэйная ф-ка, АЎЫЧЫНЬНІКАЎ—міліцыя, ЛУР'е—яч. ф-кі «Кастрычнік» і ТАМАШЭВІЧ — кандытарская ф-ка; ад рэд. «Совецкая Беларусь»: ШАСТАКОЎ—Белдзяржбуд і КУЧЫНСКІ—яч. п.-к. краўцоў; ад БАН: ВАЛАБРЫНСКІ—саюз будаўнікоў, БЯЛУГА—цэнтр. рабочы. амбуляторыя і ІГНАТОЎСКІ—яч. Гандальбуду; ЧАРВЯКОЎ (ЦВК)—ф-ка «Кастрычнік», БЭНЭК, (СНК)—Белдзяржбуд, ГОЛЬДБЭРГ (Белдзяржплян)—Белдзяржбуд. ЛАБАДАЕЎ (Агітмас. аддз. ЦК)—нарсувязь; ДУНЕЦ (рэд. «Акцябр»)—Гандальбуд; РАЧЫЦКІ (Наркамзем)—ГАНДАЛЬБУД, ПЛАТУН (НКА)—ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык», АКУЛІК (Белпэдтэхнікум)—шпалерная ф-ка, КУКЕЛКА (Польпэдтэхнікум)—яч. Беллпэдтэхнікуму, АКСЮЧЫЦ (АВК)—футровая ф-ка, ДЖЭЛЮК («Чыр. Зьмена»)—завод «Прапетары», ШАПІРА (ЦСПСБ)—п.-к. паліграф і ХЭЙФЭЦ (ЦП саюзу мэдсанпрацы)—п.-к. абутнікаў.**

**Ячэйкам дагаварыцца з дакладчыкамі аб часе правядзеньня дакладаў і даклады вынікаў сакавіковага пленуму ЦК КП(б)Б паставіць на адкрытых партыйных сходах з 12 па 27 красавіка.**

### СЁНЬНЯ

**Дом Камасьветы:** У 19 гадз. (пак. № 3) заняткі гуртка ангельскае мовы.

**Нэрвовая клініка.** Пасядж. фізыка-тэрапэўтычнае сэкцыі навуковай асацыяцыі — у 20 з пал. гадз. Парадак дня: Перавыбары бюро, 2. Дэманстрацыя хворых, 3. Дацэнт Д. Маркаў—аб прыгорнасьці хронаксымэтру Барутаў і 4. Дацэнт М. Шапіра—аб спэцыф. зьмене ў мускулах пры некаторых артаперазахворваньнях.

### ЗАЎТРА

**Клюб навуковых працаўнікоў.** У 2 гадз. заняткі марксыцка-ленінскага гуртка пад кіраўніцтвам т. **Выдры.**

**БДУ.** Пасядж. асьпіранцкага гістарычнага сэмінару ў 19 гадз. у прыродазнаўчым корпусе, аўд. 4. Даклад т. **Скардзіса** на тэму: «Праднасылкі аграрнай рэформы 1861 г. на Ковеншчыне». Запрашаюцца асьпіранты-гісторыі БДУ і БАН.

**Пяцідзенны рабочы ўнівэрсытэт.** Заняткі ў-ту ў 18 з палов. гадз. у 41 аўд. старога будынку пэдфаку.

**Дом Камасьветы.** Аддзел культуры і прапаганды МенАК КП(б)Б склікае 19 гадз. агульна-гарадзкую нараду сакратароў вучобы масавых сэктараў ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ, прапагандыстых і агітатараў, пры ўдзеле нізавога партыйнага і камс. актыву для абмеркаваньня справаздачы аб працы Дома Камасьветы за зімовы час і аб задачах на вясеньня-летні час. Пасьля нарады—мастацкая частка. Білеты ў райкома КП(б)Б і ЛКСМБ.

### ПАСЬЛЯЗАЎТРА

**Фрунзаўскі РК КП(б)Б (пакой Асоавіяхіму).** Пашыранае пасяджэньне пры выдыпуму разам з асоавіяхімаўскім актывам—у 18 гадз. Выклікаюцца сакратары яч. Асоавіяхіму белпэдтэхнікуму, мутэхнікуму, польтэхнікуму, завод «Камунар», Пушкінскай б-кі, навучальна-вытворчых майстэрняў акрінспэктарыяту нарасьветы і прадстаўнік райкому камсамолу Фрунз. раёну, сакратар яч. Белдзяржкіно і ЖАКТу № 12.

**Нарада сакратароў яч. «ПН».** 17-га красавіка ў 19 гадз. у акрінспэктарыяце нарасьветы (пакой № 12)—нарада сакратароў яч. «ПН» г. Менску.

**Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.**


Нарада жонак кампалітскладу Менскага гарнізону.
Аўторак, 15 красавіка
МЕНСКІ АКРУГОВЫ КАМІТЭТ МОПР'у
скліча
Ў ПАМЯШК. АК МОПР'у (Савецкая, 87, 2-гі паверх)
НАРАДУ ЖОНАК КАМПАЛІТСКЛАДУ Менскага гарнізону
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб работе МОПР'а сярод жонак кампалітскладу і падрыхтоўка да 1-га Мая.
Просьба да ўсіх жонак кампалітскладу зьявіцца без спазьненьня.
Запрашаецца кампалітсклад.
Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. Мен. АК МОПР.



Дом Пісьменьніка (Савецкая, 68)
СЁНЬНЯ, 13-га красавіка, а 7 з пал. гадз. увеч.
НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ЛІТАРАТУРНАЙ СЭКЦЫІ ТАВАРЫСТВА МАРКСЫСТЫХ І ПІСЬМЕНЬНІКАЎ
дацэнт БДУ т. Сякерская прачытае даклад на тэму:
„Марксыцкае вучэньне аб ідэалёгіі і задачы пралетарскай літаратуры".
Запрашаюцца пісьменьнікі, крытыкі, навуковыя працаўнікі, настаўнікі, студэнты, рабочыя і ўсе, хто цікавіцца гэтым пытаньнем.
УВАХОД ВОЛЬНЫ
ПРАЎЛЕНЬНЕ ДОМУ ПІСЬМЕНЬНІКА.



14 красавіка а 7 г. увеч. у памяшканьні клюбу Акрвыканкому
рэдакцыяй часопісі „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА"
СКЛІКАЕЦЦА
ШЫРОКАЯ НАРАДА ЎСІХ РАБКОРАК І СЬЦЕНКОРАК гор. Менску.
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Аб кваліфікацыі работніц. 2. Аб задачах часопісі ў сувязі з рэарганізаваньнем партапарату.
Пасьля нарады—канцэрт.



ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ
склікаецца на 14-га красавіка
а 11 гадз. раніцы ў памяшканьні клюбу саўгандальслужачых гор. Менску
з наступным парадкам дня:
1. Аб пасеўкампаніі і калектывізацыі і чарговых задачах саюзу (дакл. тав. ПЛЯТНЕЎ).
2. Аб рэарганізацыі саюзнага апарату і правядзеньні кампаніі аб перавыбарах МК (дакл. т. ГЛІКІН).
3. Аб чыстцы сав. апарату і аб удзеле саюзу ў гэтай рабоце (дакл. НК РСІ).
4. Даклад Наркамасьветы аб падрыхтоўцы кадраў і суддаклад культсэктару ЦП саюзу.
Запрашаюцца старшыні ўсіх МК і ГК і прафактыў.



Фабзаўком Друкарні ВАН, МК ВАН, Бюро партыйнай ячэйкі Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук з глыбокім жалем паведамляюць усіх рабочых, работніц і служачых аб раптоўнай сьмерці рабочага-вылучэнца загадчыка друкарні ВАН
МЕЛЕНЦІЯ ФЁДАРАВІЧА РЫБАКОВА,
у горадзе Віцебску 11-га красавіка—увечары.
Для ўдзелу ў пахаваньні выяжджае дэлегацыя.
ФЗК. МК. Бюро ячэйкі і Прэзыдыум ВАН.


# ТЭАТР і КІНО


БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Б. Лаўрэнеў.
Панядзелак, 14 красавіка для саюзу будаўнікоў
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. Пачатак а 8 гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Мастацкі фільм вытворчасьці Белдзяржкіно
ГАТЭЛЬ САВОЙ у 6 част.
Звыш праграмы культур-фільм у 3 частках. Зямля кліча
Пачатак а 7 г. Каса ад 5 гадз.
На дзенных кіно-сэансах дэманструецца:
1. Культ-фільм у 6 частках НАФТА
2. Вясёлая камэдыя ў 7 ч. Лятучае шчасьце.
Дзенныя сэансы: 1 гадз., 3 гадз. 20 м.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Нямецкі фільм Марцін Фальхаген
У галоўнай ролі Жэні Портэн.
Звыш праграмы: кіно-хроніка „Совкино"
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ:
Дзенныя: 1 гадз. 30 м., 3 гадз.
На дзенныя сэансы ўсе білеты па 25 кап.
Каса ад 12 гадз. дня.
Вечэрні: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса ад 5 гадз.

КІНО ПРОЛЕТАРЫ
З прычыны выключнага посьпеху 2-гі тыдзень мастацкі фільм
ЮДА
меладрама ў 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Юны Піянэр
Мастацкі фільм па аповесьці Д. ФУРМАНАВА
МЯЦЕЖ
у 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га-3 г. 30 м.
Каса адкрыта ад 12 гадз.

КІНО СПАРТАК
Звыш праграмы выступленьне РАЗАНСКІХ БАБ Фёдаравай і Русінскай.
У рэпэртуары частушкі—лубок
На экране выдатны фільм БАБЫ РАЗАНСКІЯ
драма ў 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса—ад 5 г. 30 м.



СКОРА
мастацкі фільм
ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ
па аповесьці Ус. ІВАНОВА

СЁНЬНЯ 13-га красавіка
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
АДЗІНЫ ВЕЧАР этнаграфічнага ансамблю горных арлоў Каўказу.
(ВЕЧАР УСХОДУ)
Нацыянальныя танцы народаў Каўказу (Стары і новы Каўказ).
Сьпевы Каўказу (сольныя і харавыя)
КВАРТЭТ: Зурна, Дудука, Самамура і Долі
Білеты прадаюцца. Падрабязнасьці ў афішах.

ВЫСТАЎКА
ПРАЕКТАЎ НОВАГА БУДЫНКУ БАН
АДЧЫНЕНА
з 13 красавіка ў будынку БАН
(Ленінская, 29-35, 2-гі паверх)
з 2-х гадз. дня да 10 гадз. увечары.
УВАХОД ВОЛЬНЫ.
ПРЭЗЫДЫУМ.



КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА
Аўторак, 15-га красавіка
ТОЛЬКІ АДЗІН КАНЦЭРТ
СОЛЬНЫХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ
пэдагогаў музтэхнікуму на ўсіх муз. інструмантах.
ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ Ў АФІШАХ.
Білеты ад 30 к. да 95 к. прадаюцца ў рабочай касе, а ў дзень канцэрту і ў касе клюбу Карла Маркса з 6 гадз. увеч. Па калектыўных заяўках КРЭДЫТ.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!
Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!
Збор лекавых траў—
ДОБРЫ ЗАРАБОТАК
для дзяцей беднаты.
Белмэдгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'ян, беляну, талакнянку, пальнь (ліст), ліп